Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!
ФРАНЦІШАК БАГУШЭВІЧ



НАША СЛОВА

ІМЯ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

Газета выходзіць з сакавіка 1990 года № 51(436) 22 СНЕЖНЯ 1999 г.

З КАЛЯДАМІ ЦЯБЕ, БЕЛАРУСКІ НАРОД !



Незадоўга да Каляд сваім дэкрэтам папа Рымскі абвясціў аб стварэнні ў Беларусі новай дыяцэзіі (біскупства) Віцебскай. Біскупам прызначаны пробашч магілёўскага касцёла Святога Станіслава Уладзіслаў Блін. Касцёл Святой Барбары абвешчаны кафедральным. Першае ўрачыстае набажэнства біскуп Уладзіслаў вёў на беларускай мове. На здымках: біскуп Віцебскі Ўладзіслаў Блін, кафедральны касцёл Святой Барбары. Фота Аляксандра Хітрова. БелТА.

Божае Нараджэнне – КАЛЯДЫ

Евангелле не падае дакладнай даты і дня нараджэння Хрыстуса. Першае пакаленне хрысціян не надавала гэтаму спецыяльнага значэння. Галоўным была дзейнасць Хрыстуса, асабліва Яго Вялікодная справа збаўлення. У Святым пісанні час нараджэння пададзены агульна: "Езус нарадзіўся ў Бетлееме ў Юдэі, у час гаспадарання цара Ірада" (Мц 2,1), а таксама факт публічнай дзейнасці: "... ў пятнаццатым годзе гаспадарання Цэзара Тыберыя" (Лк 3,1).

У перыяд Каляд асабліва ўрачыста святкуюцца два святы: Божае Нараджэнне (25 снежня) і З'яўленне Панскае (6 студзеня).

У Рыме першыя ўспаміны пра Божае Нараджэнне спатыкаем у IУ стагоддзі. Ва ўсходнім Касцёле на падобным грунце з'явілася некалькі раней свята падобнага зместу пад назвай Тэафанія або Эпіфанія, святкаванае 6 студзеня. Адзначаецца З'яўленне Хрыстуса: мудрацам з Усходу, у час Хрэсту ў Іардане і ў час першага цуду ў Кане Галілейскай. Пазней гэтыя традыцыі перамяшаліся: на Усходзе пачалі святкаваць Божае Нараджэнне, а на Захадзе – урачыстасць З'яўлення Панскага.

Зместам урачыстасці Божага Нараджэння з'яўляецца не толькі гістарычны прыход Хрыстуса, але і факт Яго Уцелаўлення. Хрыстус з'яднаў дзве асобныя дагэтуль рэчаіснасці. Адвечнае Слова стала Целам. Божы Сын стаў чалавекам.

Да свята рыхтуюцца пэўны адрэзак часу, які называецца Адвантам – гэта чатырохтыднёвы пост, час навяртання і чакання. Перадсвяточныя пакупкі, парадкі і, перш за ўсё, - парадак ва ўласнай душы цераз паяднанне з Богам і бліжнімі ў Сакраманце Пакаяння і Прымірэння заканчваюцца напярэдадні ўрачыстай вячэры, так званай куцці, 24 снежня. У гэты дзень вернікаў абавязвае сціслы пост, а ўсе стравы на куцці – посныя.

Вакол свята Божага Нараджэння з'явілася многа звычаяў, якія старанна захоўваюцца, яны нясуць у сабе эмацыянальны настрой, напамінаюць сямейнае кола і дзяцінства. Яны нясуць у сабе не толькі рэлігійны сентыменталізм, але і глыбокае перажыванне, якое адчуваецца перш за ўсё падчас гэтай ўрачыстай вячэры. Яна нясе ў сабе штосьці звышурачыстае. І тут варта ўспомніць словы Хрыстуса: "Дзе двое або трое сабраліся дзеля майго імя, там і я ёсць сярод іх" (Мц 18,20). Нездарма сабор назваў хрысціянскую сям'ю хатнім храмам. Маладыя вучацца ў старэйшых, пераймаюць іх традыцыі, паглыбляюць свае веды ў рэлігіі.

У час вячэры прысутнасць Хрыстуса акцэнтуецца сумеснай малітвай, чытаннем Евангелля і запальваннем свечкі або святла на ёлцы.

Куцця, паводле мясцовага звычаю, зачынаецца на змярканні пасля з'яўлення першай зоркі. Пачынаецца яна правадам адванту за святочным сталом спяваннем песні: "Вось прыйдзе Пан Бог". Бацька ці маці або найстарэйшае дзіця запальвае свечку, а потым святло на ёлцы. Спяваецца песня "Анёл Панскі". Найбольш распаўсюджанай малітвай з'яўляецца наступная: "Божа, Ойча наш, у гэтую ўрачыстую хвіліну выхваляем Цябе і дзякуем за ноч, сёння ўспамінаную, у якую Ты паслаў нам Свайго Сына Езуса Хрыстуса, нашага Пана і Збавіцеля. Просім Цябе: дай нашай сям'і любоў, згоду, мір, абдары суседзяў, прыяцеляў і знаёмых мірам гэтай ночы, усіх забытых і адзінокіх, хворых і бедных пацеш Добрай Навіною, памёршых (пры гэтым называюцца імёны) абдары шчасцем і святлом Тваёй хвалы..." У перапынках паміж просьбамі ўсе ў адзін голас адказваюць: "Выслухай нас, Пане!"... Хто-небудзь з прысутных чытае фрагмент з Евангелля: "Выйшаў ад кесара Аўгуста загад зрабіць спіс жыхароў ва ўсёй дзяржаве. Гэты спіс быў першы за гаспадарання Квірынея ў Сірыі. І пайшлі ўсе запісвацца, кожны ў сваё места. Пайшоў таксама і Язэп з Галілеі, з места Назарэту ў Юдэю, у места Давідавае, званае Бэтлеемам, бо ён быў з дому і роду Давідавага, запісацца з Марыяю, заручанай з ім жонкай, што была цяжарная. Калі ж яны былі там, падыйшоў час радзіць ёй і нарадзіла Сына Свайго Першага і спавіла Яго, і палажыла Яго ў Жолаб, бо не было ім месца ў заездзе..." (Лк 2,1-8). Можна прачытаць і даўжэйшы тэкст: Лк 2, 1-14; Мц 1, 18-24; Ян 1, 1-8.

Затым бацька выказвае кожнаму пажаданне і дзеліцца калядой (аплаткай) спачатку з маці, а пасля з усімі хатнімі, якія ў сваю чаргу выказваюць адзін другому пажаданні і дзеляцца калядой. Сама вячэра павінна праходзіць у атмасферы ўзаемнага братэрства і зычлівасці, згодна з мясцовымі традыцыямі. Пасля вячэры спяваюць калядныя песні, пасля чаго ўсе ідуць на Святую Імшу да касцёла-зазвычай апоўначы, дзе і сустракаюць урачыстасць Свята Нараджэння Хрыстуса.

Першы дзень Каляд святкуецца пераважна дома, у сямейным коле. У гэты дзень выключаюцца ўсялякія візіты. Усе павінны памятаць пра рэлігійны характар дня, абавязкова ўдзельнічаць у Святой Імшы.

Ад Каляд распачынаецца Вялікі Юбілей хрысціянства – год асаблівай ласкі Божай. Навяртанне – гэта адна з галоўных апор часу ласкі. Касцёл прагне перажыць гэты Юбілей у адзінстве з Богам і ўсімі людзьмі.

Неўзабаве Свята Каляды прыдзе ў дамы католікаў, а 7 студзеня сустрэнуць яго праваслаўныя.

Свята Каляды – гэта найперш свята радасці, любові і ўзаемнага міру. Нездарма напярэдадні свята і ў час яго людзі віншуюць адзін аднаго, жадаюць моцнага здароўя, шчасця і шчодрых бласлаўленняў нованароджанага Збаўцы.

Мечыслаў Хвайніцкі,
г. Ліда.

Дзяржаўнаму літаратурна-мемарыяльнаму музею Якуба Коласа 40 гадоў

Спадарыні Камароўскай, дырэктару Літаратурнага музея Якуба Коласа
66-А, пр. Ф. Скарыны, Мінск-72

Шаноўная спадарыня Зінаіда!

Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны далучаецца да ўсіх тых віншаванняў, якія атрымаў музей з нагоды слаўнага юбілею -- 40-годдзя з дня заснавання.

Жадаем супрацоўнікам музея і надалей годна несці ў жыццё імя класіка беларускае літаратуры, актыўна прапагандаваць ягоную творчасць, без якое немагчыма ўявіць сабе вобраз роднае Беларусі.

Няхай Дом Якуба Коласа сагравае сваёй цеплынёю сэрцы ягоных наведвальнікаў, а таксама выклікае любасць да роднае старонкі ды лучыць усіх нас у адзіную беларускую сям'ю!

Жыве мова Якуба Коласа, а разам з ёю і наш народ!

Старшыня ГА ТБМ імя Ф. Скарыны Алег Трусаў.

Заслужаны артыст краіны

Званне "Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь" прысвоена дырэктару і вядучаму акцёру Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа Рыгору Іванавічу Шацько. Гэтым высокім званнем ён узнагароджаны за вялікі асабісты ўклад у развіццё тэатральнага мастацтва.

Упершыню Рыгор Іванавіч трапіў на коласаўскую сцэну ў 1984 годзе. Яго дэбютам стала роля Аляксандра Залатнікова ў спектаклі "Ах, які пасаж!", а этапамі ў творчай біяграфіі - вобразы ў спектаклях "Дзядзя Ваня", "Рэцэпт Макропуласа", "Марлен... Марлен", "Шагал... Шагал...".

Фота Аляксандра Хітрова. БелТА.

№ 51(436) 22 СНЕЖНЯ 1999 г. НАША СЛОВА

Пошук свайго

(лексіка-гістарычныя нататкі)

Каляды ці ***Раство, калядаваць*** будзем ці ***ражаствава́ць***? Вядома, што хрысціянская царква прымеркавала да старажытнага (дахрысціянскага) зімовага цыклу свят нараджэнне Хрыстова. Старажытныя Каляды былі першымі святамі ў гадавым цыкле працоўных свят і суправаджаліся цэлым шэрагам абрадаў. У беларусаў гэта адлюстравалася ў словах ***Каляда, Каляды (Колядa), Калядкі, Калядачкі, калядаванне, калядаваць, калядніца, калядоўнік і калядоўшчык, адкалядаваць, перадкалядны, пакалядную***. З прыняццем намі ў канцы X-га стагоддзя хрысціянства гэты набор слоў для абазначэння свята і абрадаў стаў нанаўняцца новым зместам – хрысціянскім. Царкоўная літаратура прынесла і царкоўнаславянскае слова ***Рождество***, якое на нашай усходнеславянскай моўнай глебе магло выступаць і ў мадыфікаваных формах ***Рожество, Рожение*** і іншых. Яны абазначалі і факт нараджэння Хрыста і свята Каляд (Нараджэння Хрыстовага).

Як сведчыць старабеларуская пісьменнасць, жывая беларуская мова вельмі рана пачала пазбягаць ужывання царкоўнаславянізму і карыстацца сваім уласным словам для абазначэння гэтага свята. Вось некалькі прыкладаў: "... ему почати корчмы варыти на ***Божье Нароженье*** "(1487г., Кніга запісаў Метрыкі ВКЛ, с.227), "...маютъ лучники тыи луки воеводе давати къ Великодню и къ ***Божьему Нароженью***" (1499 г., Акты, относящиеся к исторiи Западной Россiи, т.I, с.195), "...мелъ ми тыи пенези отдати о ***божъемъ нароженьи*** минуломъ святе" (1533 г., Кніга Віцебскага замкавага суда, с.4), "...давность заплате за испанъ не маетъ далшая быти только... до ***божъего нароженья***" (Статут 1588 г., с.510). Гэтак і В. Цяпінскі ў сваім паралельным евангеллі перадае царкоўнаславянскае ***рожество***: "ис/у/сь/ х//ри/с/то/во рож/е/ство и /су/са х/ рыст/а ***нароженье***" /Евангелле, 1580г., с.26/. Гэта ўжо сучаснае слова ў тагачаснай арфаграфіі, тэк, без перадачы гука ***Z (ож)***, хоць у прыроднай ен тады існаваў: "Лета Божего ***народженя*** тысеча пятьсотъ пятьдесятъ третего" / 1533 г., Акты, относящиеся к исторiи Заподной Россiи, т.24, с.137/.

Тэрмін ***Нараджэнне Божае /Хрыстова/*** у старой беларушчыне ўжываўся побач з ***Калядамі***: "...позычилъ седло... перед русскими ***Коляды***" /1552 г., Акты, относящиеся к исторiи Заподной Россiи, т.18, с.155/, "Лея... тые хусты Ганны Овхимовое, вжо рокъ на ***Коледу*** будетъ, въ трохъ грошей литовскихъ... заставила / 1577 г., тамсама, т.5,с.7.

Слова ***Каляды (Коляды)*** з-за большай гістарычнай і побытавай заглыбленасці ў народнае жыццё развіло вялікае гняздо дэрыватаў /пералічаны вышэй/, тады як ***Рожество*** засталося тэрмінам – адзіночкай. Адпаведнікаў нашым ***калядаваць, клядаванне, калядоўнік*** і іншым не ўтварылася, няма ***ражаставання*** ці ***ражаставаць***. Відавочна пагэтаму беларускія перакладныя слоўнікі, пачынаючы з "Падручнага расійска-крыўскага (беларускага) слоўніка" В.Ластоўскага (Коўна, 1924) і канчаючы сучаснымі "Русско-белорусскими словарями" (М., 1953; Мн. 1982; Мн.1993 і наступныя) царкоўнаславянска-расійскае ***Рождество*** і ***рождественский*** перадаюць па-беларуску як ***Коляды (Каляды)*** і ***калядны.***

Але вось у апошнія гады з узмацненнем у нас ролі маскоўскай праваслаўнай царквы на старонкі беларускамоўнага друку паплылі шырокай плынню неўласцівыя беларускай мове, не зафіксаваныя ў слоўніках літаратурнай мовы, дзіўныя з пункту погляду беларускай фанетыкі ***Ражаство, Ражство, Раство, Рожджаство***: "Пасланне да Ражства Хрыстова мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха Ўсяе Беларусі" (Звязда, 5 студзеня, 1997 г.). Вераголна, гэта такі пераклад рэдакцыі газеты. Але ж у наступным годзе "Каляднае пасланне мітрапаліта Мінскага і Слуцкага Філарэта, Патрыяршага Экзарха Усяе Беларусі" падпісана: Філарэт, мітрапаліт Мінскі і Слуцкі, Патрыяршы Экзарх Усяе Беларусі Ражство Хрыстова, 1997/1998гг., Мінск" / Звязда, 6 студзеня, 1998 г.) І ў тэксце маем толькі ***Ражство***. Значыць, гэта воля аўтара паслання, галавы праваслаўнае царквы на Беларусі. Тым болей, у гэтым самым нумары газеты ў рубрыцы "Беларускі культурна-асветніцкі каляндар" у рэдакцыйным тэксце чытаем: " 7 студзеня ... Каляды (Нараджэнне Хрыстова). Па каляндары праваслаўнай канфесіі". І на старонкі іншых беларускамоўных газет хлынулі гэтыя тэрміны: "Кляновы крокі ліст чакае Ражаства" (ЛіМ, 18 снежня, 1998 г.), да польскай Вігіліі – святочнай вячэры перад Раством Хрыстовым (Навіны, 18 снежня, 1998г.). Нават "Наша слова" не абышлося без Раства: Святкаванню Раства Хрыстова... папярэднічае 40-дзённы пост (Наша слова, №2, 1997 г., с.5). Асабліва густа ***Ражаство*** і ***Раство*** напаўняе беларускі эфір напярэдадні і ў дзень праваслаўных Каляд. І гэта ідзе побач з натуральнымі беларускімі тэрмінамі. Відавочная збыткоўнасць з пераходам ад свята духоўнасці да палітыкі, да абрусення беларускай праваслаўнай тэрміналогіі.

Наш выбар павінен быць на карысць тэрмінаў, якія склаліся ў нас гістарычна і гучаць натуральна, не парушаюць беларускай гукавой сістэмы – ***Коляды*** і ***Каляды***, ***Нараджэнне Хрыстова (Божае)***. Адзначым, што ні пяцітомавы "Тлумачальны слоўнік беларускай мовы" (т.4. Мн., 1980), ні апошні па часе публікацыі "Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы" (М., 1996) ніякага ***Раства*** ці ***Ражаства*** ў беларускай мове не фіксуюць. Ды і праваслаўная царква беларусаў не ўся карыстаецца тэрмінам ***Раство***. Так, у адрозненне ад мітрапаліта Філарэта, кіраўнік Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы мітрапаліт Мікалай 7 студзеня таго ж 1997 года, віншуючы па радыё "Свабода" беларускі народ са святам, сказаў: ***"Мы сёння святкуем свята Нараджэння Хрыста або Каляды"***. Напэўна ж людзі і Бог яго словы пачулі.

І. Крамко, старшы навуковы супрацоўнік НАН Беларусі.

Дзеду Талашу 155

25 снежня -- дзень нараджэння Васіля Ісакавіча Талаша -- народнага героя, удзельніка партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі ў час грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, прататыпа дзеда Талаша з аповесці Я. Коласа "Дрыгва". У 1919 годзе Талаш арганізаваў і ўзначаліў партызанскі аддзел, быў разведчыкам. У гады Вялікай Айчыннай вайны стогадовы дзед быў арыштаваны немцамі за сувязь з партызанамі. З 1943 года дзед Талаш у Маскве, выступаў перад байцамі, якія ішлі на фронт. Улёткі з яго заклікамі распаўсюджваліся на акупаванай тэрыторыі Беларусі.



На здымку: дзед Талаш і Якуб Колас.

Фота з дасье БелТА.

Павел Сцяцко,

доктар філалагічных навук, прафесар, намеснік старшыні Гарадзенскай абласной рады ТБМ імя Францішка Скарыны

"З гушкой моўнай практыкі..."

Працяг

Цяць, выцяць ці толькі ўдарыць? У перыядычным друку ды ў творах непатрабавальных да мовы аўтараў амаль не сустрэнем адмысловых беларускіх словаў ***цяць, выцяць***, а толькі ***ўдарыць***. Між тым акадэмічныя беларускія слоўнікі – перакладныя і тлумачальныя – падаюць як адэкват рас. ***ударить*** і словы ***выцяць, цяць***. РБС –53 засведчыў: "Ударить сов. 1.(нанести удар) ударыць, выцяць; ударить палкой – ударыць (выцяць, стукнуць) палкай; ударять (наносить удары) ударацъ, выцінацъ; ударяться – ударацца, выцінацца, ударенный – ударацы, вытнуты" (с.707). Тое самае бачым і ў перавыданнях: РБС-82 (Т.2. С.515), РБС-93 (Т.3. С.587). Аднак формы незакончанага трывання ўжо чамусьці не маюць гэтых адмысловых словаў ***выцяць*** і ***выцяцца***, а толькі ***ударыць***. Вось як набліжалі нашую мову да рассейскай. Праўда, БРС-62 і БРС-89 падаюць і свае словы: "Выцяцца сов. удариться, ушибиться; балюча выцяцца галавой - больно удариться (ушибиться) головой. Выцяць сов. ударить (причинить ушиб – ещё) ушибить; выцяць сабаку – ударить собаку; выцяць нагу – ударить (ушибить) ногу (БРС-62. С.191). Бачым тут і менш пашыраныя формы ***вытнуцца*** і ***вытнуць*** (з адсылкай см. ***выцяцца, выцяць*** (с.188). Падае слоўнік і "Тнуць сов. аднокр. обл. 1.ударить; тнуць пугай – ударить кнутом; 2.(о насекомых) укусить, ужалить (с.919). Двухтомны БРС – 88,89 фіксуе таксама: "Цяць сов. 1.ударить; хлестнуть; 2. укусить, хватить; сабака моцна цяў за ногу – собака сильно укусила (хватила) за ногу; 3. (чем-л.острым) резануть, рубануть; хватить; цяць сякерай – рубануть (хватить) топором (т.2. С. 688, 689). Новы "Тлумачальны слоўнік" (Мн.,1996) таксама фіксуе словы ***выцяцца, выцяць*** (с.135). цяць, тнуць: 1.Ударыць, стукнуць чым.-н. Цяў (тнуў) яму прыкладам у грудзі. 2. Балюча ўкусіць. Сабака цяў (тнуў за нагу (с.740). Праўда, не бачым тут зваротнай формы ***цяцца*** і ***тнуцца***, якія таксама актыўна выкарыстоўваюцца ў народнай мове... "Чаго ты носісся круга хаты, па-за вуглох? Каб дзе ні цяўсё аб вугло" (Грабава. Зэльвеншчына).

Такім чынам, беларуская мова мае і свае адмысловыя лексемы ***цяць, цяцца, выцяцца, тнуць, вытнуцца*** (а не толькі ***ўдарыць, ударыцца, ударацца***).

Купленка ці пакупка. Слова ***пакупка*** ад ***пакупіць***; але такой лексемы беларуская мова не мае. ***Пакупка*** – гэта суфіксавае ўтварэнне ад ***покупать (покуп-ка)***. Гэтым ***покупать, покупка*** ў беларускай мове адпавядаюць бяспрэфіксавыя словы: "Купля ж. – покупка, куплянне – ср. покупка, купляць несов. покупать" (БРС –62.С.408); а таксама вытворныя "куплены – покупной; купленае палатно – пакупное полотно" (БРС – 88,89.С.626).

Тлумачальныя слоўнікі даюць такое азначэнне гэтаму слову: "Покупка.ж. Купленая рэч. Паказаць новую пакупку" (ТСБМ. С.427). Ужо сама дэфініцыя (азначэнне) выяўляе штучнасць слова ***пакупка***, бо калі гэта купленая рэч, то і натуральнае імя яе ***купленка***. У "Беларуска-расійскім слоўніку" М. Байкова і С. Некрашэвіча (Менск. 1926. С.154) засведчана: "Купля, купоўля ж. - покупка". Як і купец м. – покупатель". А ў акадэмічным слоўніку бачым словы, перанесеныя з расійскіх даведнікаў. Так, у згаданым "Тлумачальным слоўніку" 1996 года слоўнікавыя артыкулы з рэестравымі словамі ***пакупка*** і ***пакупнік*** (<***покупатель***, паўкалька яго, дзе на месцы суф. ***–тель*** ужыты ***–нік***) цалкам перанесеныя з выдання: С.И.Ожегов "Словарь русского языка. М., 1982.С.488). Параўн.: "Покупатель, -я.м. Человек, который покупает что –л.// ж. покупательница, -ы// покупательский". І ў беларускім слоўніку: "Пакупнік, -а м. Чалавек, які купляе што –н.// ж. пакупніца, -ы// прым. пакупнікі" (ТСБЛМ. С.427). Але ***покупатель*** натуральна матывуецца словам ***"покупает"***, ад якога яно і ўтворанае (***покупа-тель***), беларускія ж ***пакупнік*** і ***купляе*** ніяк не "вяжуцца" між сабою: Калі ён ***пакупнік***, то і ***"пакупае"***, а калі ***"купляе"***, то ***"купляннік"*** ці ***"купец"***. Менавіта гэтае натуральнае ***купец*** і падае БРС – 26: "Купец м. – покупатель" (с.154). Але замест сваіх словаў слоўнікі замацавалі (як лексічную норму!) ***пакупка*** і ***пакупнік***, а словы ***купец*** падалі як "просторечное" (хоць яго бачым як нейтральнае, агульнамоўнае слова ў класікаў нашай літаратуры Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага ды інш.). Так, у "Беларуска-рускім слоўніку" пад рэдакцыяй К.Крапівы чытаем: "Купец, -пца м. 1. Купец; 2. Прост. Покупатель" (БРС-62. С. 408), БРС-88.С.626).

В.Ластоўскі падае слова купленік (ПРК(Б)С. С. 295), якое таксама матывуецца ўтваральным словам куплены (купленая рэч).

Такім чынам, натуральнымі, сістэмна абумоўленымі словамі з значэннем ***'купленая рэч'*** можна лічыць словы ***купленка*** (ці ***куплёнка***) або ***купленік***. Відаць, першае з іх варта замацаваць як літаратурную норму, нацыянальнай беларускай мовы.

Пакаштаваць, паспытаць, паспрабаваць – а не адведаць. Акадэмічныя перакладныя слоўнікі фіксуюць слова ***адведаць*** як адэкват рас. ***проведать***; ***адведаць хворага – проведать больного*** (БРС-88,89.С.69). Ад гэтага дзеяслова ўтворацы назоўнік ***адведзіны 'сяброўскае наведванне кагонебудзь'***. ***Прыйсці (прыехаць) у адведзіны*** - рас. ***навестить*** (Тамсама). А вось "Тлумачальны слоўнік" 1996 г. (с.33) знайшоў у слове ***адведаць*** і яшчэ адно значэнне - адэкват рас. ***отведать 'пакаштаваць, паспытаць'***. "Адведаць спелых груш". Аднак такога значэння ў беларускай мове слова ***адведаць*** не мае. Расейскаму ***отведать*** адпавядаюць беларускія іншаканаёвыя словы. Акадэмічны "Русско-белорусский словарь" 1953 года пад рэдакцыяй акадэмікаў, слынных беларускіх пісьменнікаў Я. Коласа, К.Крапівы і членакарэспандэнта АН БССР П.Глебкі сведчыць: "Отведать сов. прям., перен. Пакаштаваць, паспытаць, паспрабаваць; отведанный – пакаштаваны, паспытаны, паспрабаваны" (с.386). тое сама бачым і ў яго перавыданнях: РБС-93 і БРС-98 (Т.2.С.379). З значэннем ***'наведаць'*** дзеяслоў адведаць выкарыстоўваюць класікі нашай літаратуры, слынныя сучасныя майстры слова. Да прыкладу: "Вашая ранейшая настаўніца колькі ўжо часу хварэе, а вы?.. Хоць бы разочак схадзілі адведаць! Ганьба!.." Брыль; "Яму хацелася адведаць дом, зноў паглядзець на роднае гняздо." Танк. І калі ў вершаваных радках, дзеля захавання рыфмамелодыкі, некаторыя пісьменнікі неаглядна выкарыстаці слова адведаць з значэннем 'пакаштаваць', то гэта не значыць, што яго трэба цягнуць на старонкі літаратурнага слоўніка, як гэта бачым і ў ТСБМ (Т.1. Мн., 1977.С.121).

(Працяг у наступным нумары.)

"Захаванне нацыянальнай, культурнай і гістарычнай спадчыны"

Конкурс на лепшую беларускую вясковую школу

Рэспубліканскія грамадскія аб'яднанні "Таварыства беларускай школы" і "Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны" распачынаюць конкурс на лепшую беларускую вясковую школу.

У гэтым конкурсе могуць браць удзел усе школы Беларусі, акрамя як з гарадоў ды раённых цэнтраў, а таксама любыя (гарадскія, вясковыя) навучальна-выхаваўчыя ўстановы (школы, ліцэі, дашкольныя ўстановы, нядзельныя школы ды г.д.) у замежных краінах, у якіх вывучаецца беларуская мова, гісторыя і культура Беларусі.

1 этап. Да канца студзеня 2000 года конкурсныя школы на адрас аргкамітэту дасылаюць матэрыялы, у якіх характарызуецца ўстанова, а таксама праца, што ладзіцца па захаванні нацыянальнай і гістарычнай спадчыны беларускага народа, і даецца вольны адказ на наступныя пытанні (для ўстаноў з замежных краінаў яны могуць быць зменены з улікам розных акалічнасцяў навучання).

1. Колькасць (і працэнт) дзетак, ахопленых беларускамоўным навучаннем.
2. Якія мерапрыемствы, гурткі ды іншыя формы выхавання, што маюць месца ва ўстанове, найлепш садзейнічаюць захаванню культурнай і гістарычнай спадчыны?
3. Якія дысцыпліны (класы і колькасць навучэнцаў) вывучаюцца ў школе на рускай ды іншых мовах?
4. На якой мове вядзецца справаводства, нарады, візуальнае аздабленне?
5. Якія газеты і часопісы выпісвае школа?
6. Ці ёсць у школе суполкі ТБМ, ТБШ ды якіх іншых грамадскіх арганізацыяў?
7. Калі школа мае музей, неабходна зрабіць яго кароткае апісанне.
8. Якім чынам укамплектаваная бібліятэка?
9. Ці бяруць удзел вучні (школа) у конкурсах, алімпіядах? Паведаміце пра вынікі.

Апісанне дзейнасці можа быць прадэманстраванае ілюстрацыямі, дакументальнымі матэр'ялами (альбомамі, газетамі, копіямі граматаў ды г.д.).

Аўтарытэтнае Журы конкурсу ў складзе вядомых грамадскіх дзеячоў, педагогаў вызначыць сем лепшых школ: па адной у кожнай вобласці Беларусі ды адна ў замежжы. Акрамя вывучэння дакументаў, метадамі вызначэння прызёраў таксама могуць быць: запыт характарыстык дзейнасці ўстаноў у рэгіянальных суполках ТБМ, ТБШ, адпаведных дзяржаўных структурах адукацыі, вывучэнне сутнасці спраў непасрэдна на месцы праз камандзіроўкі ды г.д.

2 этап. Люты 2000 г. - вызначэнне пераможцаў шляхам аналізу дасланых матэрыялаў і праз наведванне сябрамі Журы лепшых навучальных устаноў ды вызначэння першага, другога ды трэцяга месцаў.

На сустрэчу па выніках конкурсу для атрымання граматаў ды каштоўных падарункаў у Менск запрашаюцца па два прадстаўнікі ад кожнае школы-пераможцы. Прадугледжаныя таксама і дадатковыя прызы для школаў, што не ўвайшлі ў лік пераможцаў: бібліятэчкі кніг, падпіскі на газеты ды часопісы, ільготныя пуцёўкі школьнікам на адпачынак за мяжою ды іншае.

Адрас Аргкамітэту і Журы: ГА ТБМ імя Ф.Скарыны, 13, Румянцава, Менск-5 220005. Тэлефон для даведак: 8 017 284 8511.

Прэзідэнт ГА ТБШ Алесь Лозка.
Старшыня ГА ТБМ імя Ф.Скарыны Алег Трусаў.

(Правядзенне конкурсу ўзгоднена з Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.)

Палажэнне аб конкурсе на лепшага рупліўца роднага слова Арганізатары конкурса: Гарадоцкі раённы аддзел адукацыі, Гарадоцкая рада ТБМ

Мэта: - палепшэнне якасці вучэбна-выхаваўчага працэсу пры выкладанні прадметаў на роднай мове.

- выяўленне лепшых настаўнікаў, якія выкладаюць на роднай мове, папулярызацыя іх вопыта сярод педагогаў;
- прапаганда роднага слова сярод грамадства.

Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:

1. Настаўнікі беларускай мовы і літаратуры.
2. Настаўнікі пачатковых класаў.
3. Настаўнікі гісторыі, геаграфіі, іншых прадметаў.

Напрамкі дзейнасці ў межах конкурсу:

а) распрацоўка тэматычных, урочных планаў,
б) прадстаўленне нестандартных урокаў,
в) выкладанне на паглыбленым узроўні (класы, курсы, факультатывы)
г) сістэма кабінетнай работы,
д) пазаўрочная дзейнасць (удзел у конкурсах, прапаганда роднага слова, нацыянальнай культуры, сувязь з беларускамоўнымі выданнямі)

Журы ацэньвае кожны напрамак наступнымі балами:

10 - аўтарскія распрацоўкі, 9 - выдатна, 8 - вельмі добра, 7 - добра, 6 - задавальняюча, 5 - слаба.

Кожны ўдзельнік прадстаўляе матэрыялы сваёй дзейнасці: альбомы, буклеты, фотаздымкі, дакументы, распрацоўкі ўрокаў, карты куды справаздачу.

Конкурс праводзіцца: кастрычнік 1999 г. - красавік 2000 г. Матэрыялы прадстаўляюцца да 1 мая 2000 г. Выніковая канферэнцыя - 28 мая 2000 г.

Заахвочванне ўдзельнікаў:

- кожны ўдзельнік атрымлівае 20% надбаўкі да месячнага акладу;
- прызёры атрымліваюць надбаўкі да акладаў за два месяцы:

3 месца - 20%,
2 месца - 30%,
1 месца - 40%.

Асобна адзначаюцца дырэкцыі школ, якія прадстаўлены ў трох намінацыях.

Досвед працы лепшых рупліўцаў роднага слова прапагандуецца ў СМІ, выдаецца прэс-рэліз па выніках конкурсу.

Склад журы:

1. Барысенка Н.С. - старшыня журы.
2. Кузняцова В.М., Лапаціна Л.М.
3. Гаравы Л.А. - старшыня Гарадоцкай Рады ТБМ.
4. Метадысты: Дзергачова А.У., Ерашова Н.Д., Камінская Г.А., Шчамялёва Л.А.

Загадчык Гарадоцкага РАА А.А. Мурашкевіч.



Беларускі шлях да саюзу з Расеяй

Фота Мікалая Пятрова БелТА.

"Урокі акварэлі" Аляксандра Мемуса

У Віцебскім мастацкім музеі адкрылася персанальная выстава работ Аляксандра Мемуса "Урокі акварэлі". Вернісаж прымеркаваны да юбілею мастака, які займае значнае месца ў мастацтве акварэльнага жывапісу. Яго работы па акварэльнаму тонкія і прыгожыя, па жывапіснаму каларытныя.

Аляксандр Мемус вучыўся ў вядомым рэпінскім інстытуце ў Санкт-Пецярбурзе, шмат гадоў выкладаў у Віцебскім дзяржуніверсітэце. Работы мастака захоўваюцца ў фондах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі, а таксама ў прыватных калекцыях ЗША, Расеі, Ізраіля, Германіі, Польшчы і Фінляндыі.

На здымку: Аляксандр Мемус на адкрыцці выставы.

Фота Аляксандра Хітрова, БелТА.

Весткі з Бабруйска

1. Перанялі зачын.

Сябры суполкі вырашылі падтрымаць зачын Менскіх адзінадумцаў, і прынялі зварот у абарону беларускай мовы да гарадскіх улад г.Бабруйска. Збор подпісаў ідзе поўным ходам, ужо сабрана каля 200 подпісаў. Варта адзначыць руплівую актыўнасць у гэтай справе маладых сяброў суполкі Віталя Краснеўскага, Юрыя Аўрамчыка ды Эдуарда Грынявецкага. У сярэдзіне снежня зварот мяркуецца перадаць кіраўнікам гарвыканкама.

2. Менскія... адкрыцці!

Бабруйчане, як і належыць "несталічным" жыхарам, нядрэнна абазнаныя ў кірмашовых прынадах беларускай сталіцы. Але ні на "Дынама", ні ў Ждановічах, ні на "Камароўцы" свядомасць не ўзварухнеш і духоўную прагу не спатоліш. Таму і вырашылі сябры ТБМ і ТБШ наладзіць экскурсію ў Менск з адзінаю мэтай - наведаць музеі.

Сябры ТБМ і ТБШ пабывалі ў літаратурным музеі Янкі Купалы і ў музеі Максіма Багдановіча. І так сталася, што з 40 чалавек толькі двое былі ў гэтых музеях, таму наведванне іх стала хваляўнічым, шчымлівым адкрыццём і для моладзі і для людзей сталейшага веку.

Сардэчная падзяка ахвярадаўцам, што паспрыялі ў арганізацыі паездкі.

3. ТБМ імя Ф.Скарыны і ТБШ г. Бабруйска праводзяць конкурс малюнка "Слаўная мінуўшчына Беларусі" сярод дзяцей, навучэнцаў і студэнцкай моладзі. Вынікі конкурсу будуць падведзены 21 снежня, на творчай вечарыне, прымеркаванай да 90-гадовага юбілею рэпрэсаванага паэта Валерыя Маракова.

Кантактныя тэлефоны ў Бабруйску 7-61-68, 55 -62 - 65.

З павагай - старшыня суполкі ТБМ імя Фр.Скарыны г.Бабруйска Віктар Маліноўскі.

Анатолю Канапельку - 60

Творчы вечар з выпадку 60-гадовага юбілею паэта, перакладчыка, сябра Саюза беларускіх пісьменнікаў, дацэнта Віцебскага дзяржаўнага універсітэта Анатоля Канапелькі прайшоў у абласным цэнтры. Спадар Анатоль актывіст ТБМ, ён абраны сябрам рады Віцебскай абласной арганізацыі.

Фота Аляксандра Хітрова, БелТА.



"Gallina Blanca" па-беларуску

У менскім Палацы спорту завяршыўся Кубак Беларусі па мастацкай гімнастыцы. Пераможцам гэтых спаборніцтваў стала майстар спорту міжнароднага класа, срэбны прызёр чэмпіянату свету Юлія Раскіна. Астатнія месцы падзялілі яе сяброўкі па камандзе Ганна Глазкова і Валерыя Ваткіна (на здымку). Фундатарам гэтай акцыі была вядомая іспанская фірма "Gallina Blanca". Дарэчы, гэта адна з нешматлікіх фірмаў свету, якая надпісвае сваю прадукцыю па-іспанску і па-беларуску.

Фота Генадзя Сямёнава, БелТА.

№ 51(436) 22 СНЕЖНЯ 1999 г.

Наша СЛОВА

СТАТУТ

Грамадскага аб'яднання "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны"

Паважаныя сябры і прыхільнікі ТБМ!

Па просьбе шараговых сяброў ТБМ (а нас зараз каля 5000 чалавек) "Наша слова" друкуе новы Статут ТБМ, які быў перарэгістраваны ў Мінюсце Беларусі 6 верасня 1999 года.

Гэта версія нашага меншага памеру, бо адсутнічаюць уводзіны. Есць пэўныя змены і ў тэксце, якія ў першую чаргу выкліканы зменамі ў дзеючым зараз заканадаўстве.

У першую чаргу, гэта немагчымасць быць сябрамі ТБМ юрыдычных асоб. Зараз сяброўства ТБМ – сугуба індывідуальная справа.

Узмоцнена і больш акрэслена асноўная мэта дзейнасці ТБМ – гэта садзейнічанне забяспечанню беларускай мове рэальнага статусу дзяржаўнай мовы.

Мы просім усіх сяброў ТБМ і, у першую чаргу кіраўнікоў суполак, захаваць тэкст статута, каб карыстацца ім у сваёй штодзённай працы.

Старшыня ТБМ Алег Трусаў.

ЗАРЭГІСТРАВАНА
Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь 24 снежня 1991 года. Пасведчанне № 214

ПЕРАРЭГІСТРАВАНА
Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь 22 сакавіка 1995 года Пасведчанне № 0129

ПЕРАРЭГІСТРАВАНА
Міністэрствам юстыцыі Рэспублікі Беларусь 06 сентября 1999 года Пасведчанне № 00528

ПРЫНЯТЫ на Установчым з'ездзе ТБМ 27 чэрвеня 1989 года

ПРЫНЯТЫ ў новай рэдакцыі на пасяджэнні Рэспубліканскай Рады 9 сакавіка 1995 года

ПРЫНЯТЫ ў новай рэдакцыі VI з'ездам ТБМ 17 красавіка 1999 года

1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Грамадскае аб'яднанне "Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны" (далей па тэксту – ТБМ) -- добраахвотная масавая грамадская арганізацыя, у якой аб'ядналіся грамадзяне з мэтай культурна-асветніцкай дзейнасці ў галіне адраджэння беларускай мовы ў Беларусі і праз яе – усёй беларускай нацыянальнай культуры. ТБМ дзейнічае ў адпаведнасці з дзеючай Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Дэкрэтам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26.01.1999. № 2, Законам Рэспублікі Беларусь "Аб грамадскіх аб'яднаннях", Законам Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь", іншымі палажэннямі дзеючага заканадаўства і дадзеным Статутам.

1.2. ТБМ дзейнічае на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

1.3. ТБМ арганізуе сваю работу на прынцыпах дэмакратызму, плюралізму, самакіравання, галоснасці, падтрымлівае і развівае творчую актыўнасць і ініцыятыву яго сяброў і дзейнічае супольна з дзяржаўнымі, навуковымі ўстановамі, грамадскімі арганізацыямі Рэспублікі Беларусь.

1.4. ТБМ з'яўляецца юрыдычнай асобай, мае самастойны бухгалтарскі баланс, пячатку, штампы вызначанага ўзору з адлюстраваннем эмблемы, зарэгістраванай ва ўстаноўленым парадку, разліковыя рахункі ў банкаўскіх установах (у тым ліку валютныя; ад свайго імя выступае ва ўзаемаадносінах з юрыдычнымі і фізічнымі асобамі. Юрыдычнымі асобамі з'яўляюцца і арганізацыйныя структуры ТБМ.

1.5. ТБМ можа мець ва ўласнасці рухомую і нерухомую маёмасць дзеля ажыццяўлення статутных мэтаў і задач, за выключэннем аб'ектаў, якія згодна з законам могуць знаходзіцца толькі ва ўласнасці дзяржавы.

1.6. ТБМ можа мець сваю сімволіку і іншую атрыбутыку, якая зацвярджаецца Радай і рэгіструецца ў адпаведнасці з заканадаўствам.

1.7. ТБМ можа ўступаць у міжнародныя грамадскія аб'яднанні, удзельнічаць у стварэнні міжнародных саюзаў, грамадскіх аб'яднанняў, падтрымліваць прамыя міжнародныя кантакты і сувязі, заключаць адпаведныя пагадненні і рабіць іншыя захады, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь і яе міжнародным абавязацельствам.

1.8. Справаводства ў ТБМ вядзецца ў парадку, які вызначаны заканадаўствам. Адпаведная дакументацыя ў абавязковым парадку здаецца ў Дзяржаўны архіў.

1.9. Юрыдычны адрас ТБМ: 220005, г.Мінск, Румянцава, 13.

2. МЭТЫ, ЗАДАЧЫ І МЕТАДЫ ДЗЕЙНАСЦІ ТБМ

2.1. Асноўныя мэты дзейнасці ТБМ – аднаўленне ў грамадстве стаўлення да роднай мовы як да нацыянальнай святыні, пашырэнне яе ўжытку ва ўсіх сферах жыцця Рэспублікі Беларусь, усебаковае развіццё і захаванне яе чысціні і самабытнасці, садзейнічанне забеспячэнню ёй рэальнага статусу дзяржаўнай мовы.

2.2. Галоўная задача ТБМ – адраджэнне беларускай мовы ў дзяржаўным, грамадскім і духоўным жыцці народа, а таксама:

- садзейнічанне зберажэнню і развіццю нацыянальнай культуры і народных традыцый, гістарычнай памяці, фарміраванню самасвядомасці, пераадоленню нацыянальнага нігілізму;
- аказванне неабходнай падтрымкі ў сферы нацыянальна-культурнага развіцця беларусам, якія жывуць за межамі Рэспублікі Беларусь;
- садзейнічанне адраджэнню на Беларусі нацыянальнай асветы, забяспячэнню умоў для бесперапыннай адукацыі на беларускай мове;
- пашырэнне культурных сувязяў беларусаў з народамі свету дзеля прапаганды беларускай і засваення здабыткаў сусветнай культуры.

2.3. Для ажыццяўлення статутных мэтаў і задач ТБМ выкарыстоўвае наступныя метады:

- пашырэнне культурных сувязяў беларусаў з народамі свету дзеля прапаганды беларускай і засваення здабыткаў сусветнай культуры.
- спрыяе развіццю непасрэднага перакладу ўсіх відаў літаратуры з замежных моў на беларускую і садзейнічае выкарыстанню беларусай мовы ў працы замежных прадстаўнікоў дзяржаўных органаў, устаноў, прадпрыемстваў і грамадскіх арганізацый Рэспублікі Беларусь;
- удзельнічае ў распрацоўцы і ўвасабленні ў жыццё навуковай канцэпцыі беларускай мовы, клапоціцца пра культуру літаратурнай мовы, яе адзінства і ўдасканаленне правапісу;
- бесперашкодна атрымлівае і распаўсюджвае інфармацыю, якая мае дачыненне да дзейнасці ТБМ, засноўвае ўласныя і карыстаецца ў вызначаным парадку дзяржаўнымі сродкамі масавай інфармацыі;
- прадстаўляе і абараняе правы і законныя інтарэсы сваіх сяброў у дзяржаўных, гаспадарчых і грамадскіх органах і іншых арганізацыях;
- ТБМ мае права выдавецкай дзейнасці і свой перыядычны друкаваны орган.

3.СТРУКТУРА, ВЫБАРНЫЯ ОРГАНЫ, УМОВЫ СТВАРЭННЯ АРГАНІЗАЦЫЙНЫХ СТРУКТУР ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

3.1. Вышэйшым кіраўнічым органам ТБМ з'яўляецца з'езд, які склікаецца адзін раз на два гады.

З'езд прымае Статут і іншыя дакументы, уносіць у Статут змены і дапаўненні, абірае старшыню ТБМ, Раду, Рэвізійную камісію і яе кіраўніка, заслухоўвае і зацвярджае справаздачу Рады і Рэвізійнай камісіі, зацвярджае рэдактара выдання, вырашае іншыя пытанні, прымае рашэнне аб рэарганізацыі, ліквідацыі ТБМ.

Нечарговы з'езд склікаецца Радай ці з патрабавання не менш чым адной трэці раённых (гарадскіх) арганізацый ТБМ, або Рэвізійнай камісіяй.

Час і месяц з'езда, норму прадстаўніцтва, парадак абрання дэлегатаў вызначае Рада ТБМ.

Рашэнні з'езда правамоцныя пры наяўнасці больш за 1/2 дэлегатаў. Рашэнні прымаюцца простай большасцю галасоў ад прысутных. Парадак, форма і ўмовы галасавання вызначаюцца з'ездам.

3.2. Кіруючым органам ТБМ паміж з'ездамі з'яўляецца Рада.

Рада збіраецца не радзей як два разы на год. Рада вырашае статутныя задачы ТБМ, абірае сакратарыят, стварае іншыя рабочыя органы і камісіі, пры неабходнасці ўносіць змены і дапаўненні ў Статут; прымае рашэнні аб набыцці, распараджэнні і адчужэнні маёмасці, зацвярджае ўзоры пячаткі, сімволікі і іншай атрыбутыкі; зацвярджае рашэнні аб колькасці і тэрмінах платы ўзносаў; ажыццяўляе прыём у сябры ТБМ; вырашае іншыя пытанні дзейнасці ТБМ.

Пасяджанні Рады лічацца правамоцныя пры наяўнасці больш за палову яе сяброў.

Рашэнні прымаюцца простай большасцю галасоў ад прысутных.

3.3. Сакратарыят – выканаўчы орган, які працуе стала, выконвае пастановы і даручэнні з'езда і Рада, ажыццяўляе прыём новых сяброў, кіруе справамі ТБМ на падставе Статута ў межах правоў, нададзеных Радай.

3.4. Рада і сакратарыят ТБМ выконваюць свае абавязкі на грамадскіх асновах.

3.5. ТБМ можа мець сваіх штатных супрацоўнікаў для выканання штодзённай арганізацыйнай і тэхнічнай працы.

3.6. Аснова ТБМ – першасныя суполкі і раённыя (гарадскія), абласныя арганізацыі. Суполкі ствараюцца па тэрытарыяльных і вытворчых прынцыпах, пры наяўнасці не менш чым трох сяброў ТБМ.

3.7. Суполкі могуць аб'ядноўвацца ў раённыя (гарадскія) арганізацыі пры наяўнасці не менш чым трох суполак.

3.8. Абласныя арганізацыі ТБМ ствараюцца пры наяўнасці не менш трох раённых (гарадскіх) арганізацый.

3.9. Вышэйшым органам раённых (гарадскіх), абласных арганізацый з'яўляецца канферэнцыя, якая вызначае формы і метады іх работы і структуру выбарных органаў (Рады, Рэвізійнай камісіі), формы і ўмовы галасавання.

Канферэнцыя праводзіцца не радзей за 1 раз на 2 гады па рашэнні кіруючых органаў ці Рэвізійнай камісіі, якія вызначаюць тэрмін правядзення і колькасць сяброў.

Рашэнні прымаюцца простай большасцю галасоў ад прысутных.

3.10. Мясцовыя арганізацыі ТБМ (абласныя, раённыя, гарадскія) маюць тыя ж мэты і задачы, дзейнічаюць у адпаведнасці з гэтым Статутам.

3.11. Азначаныя арганізацыі рэгіструюцца і каардынуюць сваю дзейнасць праз рэспубліканскія кіруючыя органы ТБМ. Старшыня ТБМ валодае паўнамоцтвамі кіраўніка Таварыства як юрыдычнай асобы.

3.12. Рэвізійная камісія:

- кантралюе дзейнасць выбарных органаў і структурных падраздзяленняў Таварыства;
- правярае арганізацыю справаводства, тэрміны і змест адказаў на лісты і заявы сяброў ТБМ і іншых грамадзян.

кантралюе выкананне Статута сябрамі ТБМ.

Рэвізійная камісія ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці са Статутам.

Пасяджанне Рэвізійнай камісіі праводзіцца па меры неабходнасці, але не радзей чым 1 раз у паўгода.

Пасяджанні правамоцныя пры наяўнасці больш за палову сяброў Рэвізійнай камісіі.

Рашэнні прымаюцца простай большасцю галасоў ад прысутных.

Работай Рэвізійнай камісіі кіруе старшыня. Сябры Рэвізійнай камісіі не могуць абірацца ў іншыя выбарныя органы, а таксама займаць пасады кіраўнікоў і адказных спецыялістаў у структурных падраздзяленнях.

Сябры Рэвізійнай камісіі могуць удзельнічаць у пасяджаннях усіх выбарных органаў з правамі дарадчага голасу.

3.13. Тэрміны паўнамоцтваў выбарных органаў – два гады.

3.14. Пасяджанні калегіяльных органаў афармляюцца пратаколамі.

4. СЯБРЫ ТБМ, ІХ ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ

4.1. Сябрам ТБМ можа быць кожны грамадзянін Рэспублікі Беларусь, старэйшы за 16 гадоў, а таксама іншыя грамадзяне і асобы без грамадзянства, хто прызнае мэты і задачы ТБМ, спрыяе іх ажыццяўленню.

4.2. Вучні агульнаадукацыйных школ, маладзейшыя за 16 гадоў, навучэнцы ПТВ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў могуць аб'ядноўвацца ў юнацкія секцыі ТБМ.

4.3. Прыём сяброў у склад ТБМ ажыццяўляецца першаснымі суполкамі, а пры іх адсутнасці – раённай (гарадской) Радай, Радай ТБМ або Сакратарыятам на падставе пісьмовай або вуснай заявы.

4.4. Сябры ТБМ маюць права мець асабовыя пасведчанні і нагрудныя значкі. Узоры пасведчання і нагрудных значкоў зацвярджае Рада ТБМ.

4.5. Сябры ТБМ маюць права абірацца, быць абранымі ва ўсе органы Таварыства, карыстацца яго маральнай і матэрыяльнай падтрымкай у межах магчымасцяў ТБМ.

4.6. Сябры ТБМ абавязаны:

- імкнуцца дасканала авалодаць беларускай мовай, карыстацца ёю ў штодзённым ужытку, у сям'і, на працы, тым самым спрыяць выхаванню паважлівага стаўлення да яе;
- дапамагаць іншым авалодаць беларускай мовай;
- прапагандаваць перыядычныя беларускія выданні, кнігі на беларускай мове, садзейнічаць адкрыццю беларускамоўных дзіцячых садкоў і школ, спрыяць пераходу вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў на беларускую мову;
- зберагаць, захоўваць і памнажаць скарбы беларускай літаратурнай мовы, а таксама клапаціцца пра захаванне, збіранне і вывучэнне мясцовых народных гаворак, гапонімаў, народнай тэрміналогіі;
- клапаціцца пра павышэнне культуры як уласнай пісьмовай і вуснай, так і ў грамадскіх сферах жыцця;
- своечасова плаціць сяброўскія ўзносы;
- падтрымліваць ТБМ матэрыяльна.

4.7. Прыпыненне сяброўства ў ТБМ наступнае:

а) па ўласным жаданні;

б) па рашэнні суполкі або адпаведных кіраўнічых органаў ТБМ у сувязі з парушэннем Статута, а таксама ў сувязі з учынкамі, якія шкодзяць аўтарытэту ТБМ.

5. МАТЭРЫЯЛЬНА-ФІНАНСАВАЯ АСНОВА ДЗЕЙНАСЦІ ТБМ

5.1. ТБМ мае свае сродкі, якія фарміруюцца:

- з узносаў сяброў ТБМ;
- з дабрачынных складак яго сяброў;
- з ахвяраванняў і іншых укладаў прыватных асоб, устаноў, прадпрыемстваў, кааператыўных гаспадарак, іншых арганізацый Рэспублікі Беларусь, а таксама замежных дзяржаў;
- з паступленняў ад правядзення лекцыйнай, выдавецкай і іншых відаў дзейнасці, не забароненых заканадаўствам.

5.2. Суполкі, рэгіянальныя арганізацыі штоквартальна або (са згоды сакратарыята) з іншай перыядычнасцю робяць адлічэнні на цэнтральны рахунак ТБМ ад сваіх фінансавых даходаў у памеры не менш як 25%.

5.3. Сродкі ТБМ ідуць на прапагандысцкую, арганізацыйную, гаспадарчую і іншую статутную дзейнасць на карысць нацыянальнай мовы і культуры.

5.4. Памеры складак сяброў ТБМ вызначаюцца рашэннем Рады ТБМ.

6. СПЫНЕННЕ ДЗЕЙНАСЦІ ТБМ

6.1. Спыненне дзейнасці ТБМ ажыццяўляецца шляхам рэгістрацыі ці ліквідацыі па рашэнні 2/3 дэлегатаў з'езда або судовых органаў Рэспублікі Беларусь у парадку, прадугледжаным заканадаўствам.

6.2. Рэарганізацыя ТБМ адбываецца згодна з рашэннем з'езда, маёмасць і грашовыя сродкі пры гэтым пераходзяць да правапераемніка.

6.3. Ліквідацыя ТБМ ажыццяўляецца згодна з пастановай з'езда або на падставе рашэння судовага органа Рэспублікі Беларусь, якое ўступіла ў законную сілу.

6.4. Ліквідацыя ТБМ праводзіцца ліквідацыйнай камісіяй, створанай па рашэнні з'езда або суда. Маёмасць і грашовыя сродкі ТБМ пасля пагашэння абавязковых плацяжоў і крэдыторскай запазычанасці накіроўваюцца на ажыццяўленне мэтаў, прадугледжаных Статутам.

Тадэвуш Касцюшка

ЦІ МАЕ НАША НАЦЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ ПАЎСТАННЯ І ЯКІЯ ЯНЫ?

Тыя, каму не хапае адвагі распачаць смелыя і дабрачынныя справы, вылучаюць на першы план няздольныя цяжкасці, якія можа сустрэць задуманая справа, калі ім назавуць прыклады, што абуджаюць бадзёрасць, дык яны адкажуць, што там былі спрыяльныя абставіны, а тут непераадольныя перашкоды. (...). Паглядзім, наколькі легкаважныя іх довады і ў якой ступені памылковыя іх разважанні. (...). Хіба ж можна было надзеяцца, што суайчыннікі Вільгельма Тэля, (...), змогуць аказаць супраціўленне магутнай аўстрыйскай дзяржаве? Энэргія, любоў да свабоды і энтузіязм, якія сілкуюцца ўсведамленнем справядлівасці сваёй справы, перамаглі ўсе. Калі Галандыя, цяпер багатая (...), распачала барацьбу за сваю незалежнасць з дзяржавай, якая была ў той час самай магутнай у Еўропе, (...) яна (...) была ў найвялікшай ступені беднай краінай: яна не магла рабіць ніякіх вайсковых прыгатаванняў (...); геаграфічнае становішча нічым не засланяла яе з ніякага боку, яе абараняла адна толькі мужнасць яе жыхароў. (...). Але, каб не заханяцца чужымі прыкладамі, звернемся да суайчыннікаў. Хто сказаў бы за дзесяць гадоў да 1794 г. што мы з васемнаццаццю тысячамі войска, маючы у межах краіны ворага і ўрад, які варожа ставіўся да нас, зможам вясці вайну з трымя дзяржавамі, мужна змагацца і пакрыем сябе славай? Здаецца, што калі б хтосьці паабяцаў перанесці горы з аднаго месца на другое, дык яму паверылі б хутчэй, чымсьці гэтаму прадказанню. Але ж яно здзейснілася. І хаця ў выніку нашых памылак і нашай віны намер нацыі не быў дасягнуты, але адметны выступ вымусіў Еўропу паважаць суайчыннікаў, выявіў іх дух, які імкнецца да дабрачыннасці і свабоды, гуманнасць святкавала тады свой трыумф; селянін лічыў сябе навароджаным, калі адчуў, што ён можа быць свабодным, карыстацца правасуддзем і быць сяброўным другім людзям. Ворагі азвярэла пралівалі нашу кроў, але ніколі яны (я ўжо не кажу пра пахвалу Еўропы) так не паважалі нашу нацыю, як пасля апошняга выступу. Справядлівасць і яе абароны робяць такі вялікі ўплыў на чалавечы розум, што нават злачынны гвалт не можа адмовіць ім у павазе.

Мы мелі ў сябе прыклад таго, што перамогу даюць не колькасць войска, не досвед старых ваяроў, а энтузіязм, народжаны дабрачыннасцю і свабодай ды стойкасць. (...). Суайчыннікі, калі толькі захочуць, калі толькі выкажуць неадольнае жаданне дамагчыся свабоды, змогуць пачаць выступ (калі толькі ў гэтым будуць аднолькава зацікаўлены ўсе грамадзяне) і перамагчы супраціўніка. Толькі людзі з зачарствелай душой і абмежаваным кругаглядам лічаць, што ў нас для гэтага недастаткова магчымасцяў. (...). Удзельнікі рэвалюцыі 1794 г. ведаюць, што, калі яны яе пачыналі, людзі, якія не жадалі нічым ахвяраваць, гаварылі, што нельга рабіць выступ, што нацыя інертная і ёй нестае адвагі; мужнасць і мудрасць яны бачылі толькі ў ворагаў і заяўлялі, што толькі ў эпоху сойму можна было думаць аб незалежнасці. Якраз тое ж і цяпер: хто не з'яўляецца сябрам чалавечнасці, хто не хоча працаваць для шчасця і свабоды сваіх родзічаў, той будзе палохаць уяўленне людзей, але не стане пераадольваць цяжкасці і выкарыстоўваць сітуацыю з выгадай для народа. Разгледзім, якімі сродкамі мы валодаем.

(...) Можам ўпэўнена разлічваць на тое, што калі мы распачнем выступ і, чым больш ён будзе працягвацца, тым менш у яго будзе заставацца праціўнікаў і ўсё больш будуць павялічвацца яго сілы. Мы ўжо мелі падобныя прыклады у Францыі. Але хіба ж рускі земляроб, жорстка прыгнятаны сваімі панамі, пры спрыяльных абставінах не кінецца на сваіх прыгнятальнікаў у імкненні разбіць сваё ярмо? Хіба ж прыгнечаны казак не імкнецца вярнуць сваю вольнасць? (...). Цяпер аб зброі. Суайчыннікі напачатку свайго выступу павінны імкнуцца не да таго, каб фармаваць вайсковыя калоны, але рабіць усё, каб знішчыць праціўніка. З часам, пры спрыяльных умовах, з'явяцца арміі. Наша краіна не заслоненая, раўнінная, сюды лёгка пранікнуць, але як добра сказаў Ж.Ж.Русо, суайчыннікі не павінны перашкаджаць праціўніку ўвайсці ў межы іх Айчыны, але павінны старацца, каб ён не выйшаў з яе. Сродкам для гэтага з'яўляецца малая вайна (la petite guerre); сучаснасць яе ў тым, каб раздзяліць варожыя сілы і пазбавіць іх сілкавання.(...). Для пяхоты мы маем найлепшую зброю – касу. На думку Касцюшкі, калі касінер мае мужнасць, дык няма зброі, якая змагла б супрацівіцца касе (...). Усіх сваіх перамог французы дамагліся пры дапамозе штыка (...). Штык быў зброяй перамогі. Каса яшчэ больш эфектыўная зброя, яна даўжэй за штык, лягчэй дасягае ворага; штык толькі коле, каса ж адначасова і коле і рэжа.(...). Са штыком можна змагацца супроць аднаго; жаўнер, узброены касой, калі ён мае дастатковую фізічную сілу, зможа адначасова раніць трох ці чатырох чалавек.(...). Я хачу, каб генералы і афіцэры выступалі з прамовамі перад народам і жаўнерамі, падбадзёрвалі іх. Рымскія правадыры заўсёды перад бітвай звярталіся да ваяроў з прамовай, у якой паказвалі прычыны вайны і даказвалі яе справядлівы характар. Набходна абудзіць у змагароў адвагу, трэба распаліць у іх энтузіязм, а хіба ж гэта магчыма без звароту да іх? Чалавечая душа – не машына, яе нельга прывесць ў рух штуршком рукі, а – толькі прыёмамі маральнага ўздзеяння. Я хацеў бы, каб усе генералы і камандзіры гаварылі тым, каго яны вядуць у бой: "Вось нашы ворагі. Якія разадралі на шматкі нашу Айчыну і хацелі б зняволіць яе ўсю; гэта тыя, хто перашкаджае вызваленню вашых бацькоў, вашых братоў, вас саміх; яны вылучаюць сваіх жаўнераў

ад іх жорсткасці і ад іх капрызаў. Яны хочуць, каб каралі бралі вас у рэкруты і пасылалі рабаваць чужыя краіны. Суайчыннікі, вы нарадзіліся на гэтай зямлі, вы атрымалі яе ў спадчыну ад вашых бацькоў, тут знаходзяцца магілы вашых продкаў, тут спачывае іх прах, гвалтоўнік топча іх і адносіцца да іх з пагардай, ён трымае вас, іх нашчадкаў, у рабстве(...). Ідзіце за мной! Вы не маеце досведу, але я буду камандаваць вамі, будзем біць гвалтоўніка і не перастанем змагацца з ім да таго часу, пакуль яго не дагоніць смерць, ці пакуль ён не складзе зброі перад намі, пераможцамі. Несправядлівасць можа ўжываць усялякія хітрасці, але яна пазбаўлена магчымасці хваляваць душы.(...). Чым больш мы будзем пераконваць кожнага суайчынніка ў яго мужнасці, тым больш мужным ён стане; як і наадварот: чым больш пагардліва адносяцца да чалавека, тым ніжэй ён сам пачынае сябе цаніць. Асобныя айчынныя генералы пагардліва адносіліся да касінераў. Як жа гэтыя людзі пад такім камандаваннем маглі адважыцца на гераічныя ўчынкі? Замест таго, каб абуджаць веру ў сілу іх зброі, яны яе падрывалі. Легкадумныя галавы ўяўлялі, што чалавек не зможа змагацца ці пазбаўлены мужнасці, калі ён не адзеты ў мундзір сваёй краіны. Не форма адзення і род зброі ствараюць змагара, а адвага і імкненне да перамогі. Я б пажадаў, каб да абароны свабоды не дапускалі аніводнага генерала, які не адданы ёй. Я не спадзяюся на адданасць прысязе, бо гэтая дабрачыннасць уласціва нават рабам і слугам. Айчынны генерал і салдат павінны быць не толькі сродкамі вайсковага мастацтва, але і грамадзянамі, яны павінны лічыць недатыкальнай уласнасць кожнага чалавека ў такой жа ступені, як сваю ўласную: кожны павінен быць адважным, дысцыплінаваным, справядлівым і добрасумленным, так як зброя ўзнята не дзеля шчасця аднаго, а за шчасце ўсіх. Неабходна, каб правадыр натхняў народ любоўю да свабоды, бо як жа ён будзе гаварыць аб ёй, калі сам не любіць яе ўсёй душой? Які поспех будуць мець яго старанні? Як можна спадзявацца на гонар чалавека, словы якога супярэчаць ягоным перакананням? Я лічу, што ваенны талент змяшчаецца ў тым, каб умець выкарыстоўваць кожнае становішча для той справы, за якую змагаюцца, каб дзейнічаць адпаведна генію нацыі, рэсурсам краіны і яе геаграфічнаму становішчу. (...). Чалавечая думка бязмежна вынаходніцкая: калі мы прыкладзём намаганні, хто ведае, якія мы яшчэ знойдзем сродкі.(...). Старанасць дабіваецца ўсяго, а настойлівасць перамагае. Лойд піша, што свабода з'яўляецца самым магутным стымулам для абуджэння мужнасці змагароў. (...). Калі мы распалім імкненне да яе ў душы нашага народа, дык ён не толькі не будзе пераможаны, але сам абавязкова пераможа.(...)

Разгледзім вайсковы бок справы.

Уявім сабе армію ў некалькі дзесяткаў альбо ў сто тысяч чалавек (...). Вялікая армія мае патрэбу ў вялікай колькасці правіянту, але яна яго не збярэ, калі інсургенты будуць ёй увесь час рабіць перашкоды і хаваць правізію. Калі армія пачне падзяляцца на дробныя часткі для ўціхамірання інсургентаў і для здабывання правізіі, паўстанцы пачнуць аб'ядноўвацца і змогуць рабіць напады на невялікія аддзелы ворага; такім чынам яны змогуць задушыць, знішчыць і перамагчы гвалтоўнікаў. Мясцовым жыхарам пры малой вайне змагацца намнога лягчэй, чым ворагу. Яны ведаюць усе пераправы, усе сцежкі, пра якія ворагу невядома і якімі ён не зможа карыстацца; яны змогуць згуртавацца, зрабіць нечаканы напад на ворага, а пасля гэтага ім лягчэй схавацца.(...). Варожы салдат не зможа карыстацца тымі ж сродкамі, што і мясцовы жыхар. Салдаты павінны трымацца разам, знаходзіцца ў шыхце, паасобку яны становяцца слабымі і мала абароненымі. Суайчыннік, узброены стрэльбай ці касой, пройдзе праз усе кусты і балоты; ворагу для яго артылерыі патрэбны добрыя дарогі і бяспечныя схованні, у якія ён зможа размясціць жаўнераў. Напаследак, суайчыннікі змогуць рабіць паспяховыя начныя напады, якія стануць найбольш эфектыўнымі; агонь са стрэльбаў і варожай артылерыі ў такой сітуацыі не прынясе поспеху, каса ж зможа прынесці больш шкоды. Ноччу вораг не зможа зшыхтаваць свае войскі, не зможа выканаць манеўры і збянтэжыцца. Калі нават не ваяваць, але днём і ноччу няспынна непакоіць супраціўніка, дык жаўнеры ад гэтых цяжкасцяў стомяцца, сярод іх распаўсюдзяцца захворванні, і яны пачнуць губляць мужнасць.(...). Мы ведаем, якое вялікае значэнне ў час барацьбы мае добрая праца лазутчыкаў(...). Суайчыннікі(...) будуць няспынна сеяць няўпэўненасць сярод ворагаў і стамляць іх, таму што ў чаканні небяспекі на кожным кроку, вораг вымушаны будзе спыняцца і вясці разведку мясцовасці; інсургенты ж тым часам змогуць зрабіць на яго напад, акружыць і знішчыць, асабліва ноччу. Знаёмства з мясцовасцю вельмі неабходна для змагара. Густаў Адольф, першы герой сваёй эпохі, казаў, што без гэтага нават самы таленавіты палкаводзец не зможа дасягнуць поспеху, таму што ён будзе не ў стане зрабіць раптоўны напад на ворага ці засаду. Войска ніколі не зможа ведаць умоў мясцовасці, тым больш чужой, як тыя, хто тут нарадзіўся і жыве. Французы перамаглі Еўропу, але не змаглі справіцца з Вандэяй. Французы ніколі не нясці такіх страт у бітвах з замежнымі войскамі, як у гэтай правінцыі. Хаця там змагаліся французы з французамі, але ж вандэйцы ведалі ўсе закуткі, былі настойлівымі і мелі магчымасць падкрадвацца да супраціўніка, акружаць рэспубліканскае войска і такім чынам рабіць яму вялікія страты. Як толькі яны згадзіліся прыняць прапанаваныя ім умовы, наступіў мір. Апасля вандэйцы ўжо не змаглі распачаць вайну, бо сярод іх не было адзінства.(...). Я лічу, што ў такой вайне, якую я прапаную, нават горы не былі б карыснымі для нас. У гарах трэба мець пушкі і стрэльбы для таго, каб не прапусціць праціўніка; калі ж ён авалодае гарамі, дык ён зачыніць усе перавалы, стане марыць краіну голадам і такім чынам задушыць супраціўленне яе насельнікаў. На нашых жа раўнінах, калі суайчыннікаў выціснуць з аднаго месца, яны змогуць перайсці на другое. У нашай краіне няма такога месца, дзе б вораг адчуваў сябе цалкам у бяспецы пасля таго, як ён завалодаў ім. У асобных мясцовасцях у нас лясы цягнуцца на мілі, у іншых-нават на дзесяткі міль; супраціўніку трэба мець агромністае войска для таго, каб акружыць адзін лес, ёсць і такія лясы, якія немагчыма акружыць. Калі ўся краіна паўстане, дык ворагу будзе не да акружэння, бо на яго адусюль будуць нападаць.(...). Калі ўся нацыя пачне выступ(...), мы сфармуем шматлікую лёгкую кавалерыю, якая будзе (...) няспынна парушаць яго камунікацыі (...). Перарэзаць шляхі зносін мясцовых жыхароў немагчыма ці вельмі цяжка, асабліва ў нас, на раўнінах. Мясцовыя жыхары ведаюць усе таемныя пераправы, маюць магчымасць здалёку падаваць адзін другому знакі, у адпаведнасці з якімі яны выконваюць свае манеўры.

(Заканч. у наст. нумары.)

№ 51 (436) 22 СНЕЖНЯ 1999 г. Наша слова



Любоў Уладыкоўская - Канаплянік з Алесем Разанавым

Л. М. Уладыкоўская-Канаплянік, кандыдат філалагічных навук
дырэктар Нацыянальнага навукова-асветніцкага
цэнтра імя Ф.Скарыны

Хрысціянскі фактар і беларуская нацыянальная ідэя на сучасным этапе

Даследаванні праблем нацыяналізму сталі асабліва актуальнымі ў Беларусі за апошнія дзесяцігоддзе. Прычын таму шмат, але асноўныя – наступныя:

1. Далучэнне Беларусі да сусветнай інфармацыйнай прасторы і распаўсюджванне тут тэорый заходніх вучоных аб культурнай аўтаноміі, культурных колах, канцэпцыі нацыянальнага друку, нацыянальнай волі (Т.Кон, К.Дойч, Б.Шэйфер і інш.), ідэй расавай душы Шпенглера і Фрабеніуса і г.д.

2. Трансфармацыя зместу гуманітарных навук, паступовая пераарыентацыя і іх на нацыянальныя каштоўнасці і ідэалы з імкненнем пазбавіцца вульгарызаванага, спрошчанага падыходу да нацыянальных праблем.

3. Уступленне беларускай нацыі ў новы этап свайго развіцця, звязаны з уратаваннем незалежнай дзяржавы Рэспублікі Беларусь і неабходнасцю выпрацоўкі яе стратэгіі і тактыкі.

Сярод найбольш часта ўжывальных у навуковых і публіцыстычных артыкулах тэрмінаў – тэрмін "беларуская нацыянальная ідэя", які, часта памылкова падмяняе сабою паняцце беларускага светапогляду, беларускай самасвядомасці, нацыянальнай свядомасці і г.д. Гэта звязана не толькі з нераспрацаванасцю праблематыкі, але і з немагчымасцю дакладнай навуковай класіфікацыі і сістэматызацыі нацыянальных ідэй, з адсутнасцю крытэрыяў ці эталонаў для іх вызначэння. У самых агульных рысах пад тэрмінам "нацыя" разумеюць па-першае, культурна-гістарычную цэласнасць, па-другое, ідэалагічна-палітычную, якая можа атаясамлівацца з дзяржавай – юрыдычнай адзінкай міжнародных зносінаў. Пры шырокім спектры падыходаў да разумення беларускай нацыянальнай ідэі ўсё ж можна ўмоўна вылучыць два – дзяржаўніцкі і культурніцкі. Першы падыход пераважае ў публіцыстыцы, у сродках масавай інфармацыі, дзе інтэнсіўна шукаюць падмурак дзяржаўнай ідэалогіі. Другі падыход дамінуе ў навуковых артыкулах, дзе дэталёва аналізуецца гістарычнае мінулае і перспектывы беларускай нацыі, а апошняя разумеецца як быццё ў кантэксце нацыянальнай культуры.

У стабільных грамадствах дамінаванне прагматызму, дэідэалагізацыя натуральныя, але для краіны ў сітуацыі сістэмнага крызісу патрэбная ідэалогія, асноўная функцыя якой – указваць палітыцы сістэму ідэалаў і каштоўнасцяў, да якіх тая павінна імкнуцца. Ідэалы дэмакратыі, правоў чалавека, свабоды, дабрабыту агульныя для ўсіх, яны мусяць стаць ідэаламі і нашай дзяржавы. Але яна дасягае гэтых ідэалаў толькі праз сваю ўнутраную магутнасць, сіла якой – ў традыцыйных народных каштоўнасцях, беларускай мове і беларускай культуры. Без мэтанакіраванай, паслядоўнай, сістэмнай падтрымкі беларускай культуры і беларускай мовы дзяржава становіцца пустой юрыдычнай формай-фікцыяй, губляе ўнутраны істотны сэнс і перастае існаваць як самастойная сацыяльная сістэма, жывы арганізм.

Такім чынам, калі беларуская дзяржава не вырашыць "культурнамоўнай" праблемы, наўрад ці яна здолее адшукаць ідэю, якая б кансалідавала беларускае грамадства – разгубленае, расколатае, падзеленае.

Сёння агульная формула "беларускай нацыянальнай ідэі" наўрад ці можа быць сфармулявана, глыбока канкрэтызавана. Беларуская нацыянальная ідэя, без якой не можа быць беларускай нацыі, бо яна ёсць гістарычнай місіяй і апраўданнем апошняй, тым не менш, існуе.

БНІ – сканцэнтраваная сістэма беларускіх ідэалаў і мэтаў, форма сацыяльнай і індывідуальнай свядомасці, духоўна-інтэгральная сіла, якая не можа насіць ні класавага, ні чыста рэлігійнага характару. БНІ вызначае сэнс пройдзенага гістарычнага шляху, яна выражае філасофію жыцця і мае духоўна-маральнасны характар.

Сваю формулу БНІ я б акрэсліла як "вяртанне і набыццё свайго", а сённяшнюю задачу нацыянальнай ідэі я бачу ў неабходнасці падняцця над палітыкай так, каб стаць праявай усіх палітычных партый і рухаў, усіх сфер жыцця. Сіла БНІ – у веры, што беларуская нацыя мае законы свайго ўласнага існавання, і гэта патрабуе поўнага самавыяўлення і свабоды ад усялякага знешняга ціску.

Беларуская нацыянальная ідэя – маральная па сваёй сутнасці, бо:

а) накіроўвае чалавека і грамадства на развіццё творчага духу нацыі, правакуе грамадскую актыўнасць, улагоджвае канфлікт паміж справай і духам, прапагандуе такое грамадства, у якім чалавек мае годнасць, мужнасць, мудрасць, пакору;

б) адмаўляцца ад свайго, не змагацца за сябе – самазабойства, грэх, амаральна;

в) БНІ звяртае ўвагу на самаразвіццё і самарэалізацыю без пасягнення на свабоду іншых нацый;

г) БНІ абуджае памяць, без якой няма маралі;

д) БНІ і патрабуе ўнутранай свавводы, і дае гэтую свабоду;

ж) БНІ абапіраецца на сумленне асобы і нацыі, патрабуе самаахвярнасці і цярпення, павагі да індывідуальнасці, апоры на вечнае.

У маралі і рэлігіі – адна аснова: чалавек мае бессмяротную душу і свабоду волі. Рэлігійны, а найперш хрысціянскі аспект нацыянальнай ідэі ўсё часцей падкрэсліваецца ў працах сучасных беларускіх даследчыкаў (А.Астапенка, У.Конан, М.Крукоўскі, Л.Лыч, Ю.Хадыка і інш.).

Уплыў хрысціянства на лёс беларускай нацыі можа разглядацца ў плане знешнім, калі яно ў сваіх розных формах выступае як адзін з культурна-гістарычных чыннікаў у пэўным часе, ўнутраным, калі непасрэдна фармуе светаўяўленне кожнага канкрэтнага чалавека і праз гэта ўплывае на рэалізацыю беларускай нацыянальнай ідэі.

У адрозненне ад большасці іншых рэлігій хрысціянства знаходзіць апору не ў эпічна-міфалагічнай традыцыі, а ў асабістым прыкладзе Хрыста, што накіроўвае свабоду чалавека не толькі на ўнутраную рэальнасць душы, але і на пераўтварэнне знешняга свету, калі сам чалавек становіцца цалкам адказным за свой лёс. Беларуская ж нацыянальная ідэя ёсць нічым іншым, як добраахвотна прынятай адказнасцю ўнутрана свабоднай асобы. І яна патрабуе менавіта яркіх, свабодалюбівых, актыўных асобаў, здольных павесці за сабой людзей.

Хрысціянства, як рэлігія неадмаўлення, сцвярджэння, каласальнага ўзняцця духу, вялікага духоўнага напружання і высілкаў, чаго патрабуе падняцце над прыроднымі патрэбамі, прымушае нас памятаць, што мы маем дзве радзімы, якім трэба быць вернымі: канкрэтная зямля з яе культурай і Дух. Хрысціянства патрабуе змагання са Злом у адрозненне ад, скажам, паганства – гэтай натуральнай рэлігіі, простай і лёгкай, параджэння чалавечай псіхікі з яе імкненнем да цяпла, утульнасці, камфорту, рэлігіі, якая патрабуе бязлітаснасці да сябе дзеля выканання свайго прызначэння на Зямлі. Таму менавіта з хрысціянства лагічна выцякае неабходнасць спраўджвання беларускай нацыянальнай ідэі, а беларускім патрыётам так неабходна абапірацца на хрысціянства і жыць у яго сістэме.

Хоць у Бібліі ідэй вельмі шмат, але асноўная – ідэя станаўлення. Сучасныя філосафы называюць гэта лінейнай канцэпцыяй развіцця, якая ідзе ўперад і ўверх. Веды, навука сведчаць, што свет згарыць, замерзне, рассыплецца ў парашок, эпідэміі знішаць чалавека. Вера ж у светлую будучыню – гэта спадчына хрысціянства. Некаторыя вучоныя сведчаць, што беларускія архетыпы спароджаныя найбольш паганствам. Але ж менавіта паганства гаворыць, што быў век залаты, потым жалезны і г.д., а цяпер усё ідзе да згасання свету. У старажытнасці ўсё было лепш: былі перыяды залатога росквіту беларускай культуры, беларускай дзяржаўнасці і т.п. А хрысціянства кажа, што лепшае будзе наперадзе. Невыпадкова хрысціянства грунтуецца на ідэі ўваскрэсення, а беларуская нацыянальная ідэя – на ідэі Адраджэння...

Дык ці пойдзем мы назад, з паганствам і да паганства, дзе так цёпла, утульна, і не патрэбна вялікіх высілкаў? Да паганства, якое ўласцівае чалавеку прыроднаму, недухоўнаму? Ці ўсё ж пойдзем з хрысціянствам і наперад да хрысціянства, якое сведчыць, што шлях цяжкі, але складанасці загартоўваюць, а агонь пакут не спальвае, але ачышчае і ўздымае? Ці разумеем пазітыўна-культурны сэнс старадаўняга паганства, як народна-мастацкай рэлігійнай свядомасці з яго "верай у Боскае тварэнне, у быццё, космас, красу і самакаштоўнасць" і "захаванне паганскай творчасці ў хрысціянскай свядомасці і культурнай традыцыі" (Ул. Конан).

Толькі праз рычаг духу можна ў рэшце рэшт атрымаць дадатковую сілу, можна пераадолець душэўную слабасць, беларускую вяласць і абыякавасць і АДРАДЗІЦЦА. Натуральны, недухоўны чалавек, паганец, заўсёды толькі губляе – старэе, забывае і г.д. Духоўны ж чалавек і адпаведна нацыя, якая развівае свой дух, як бы ні спатыкалася, якія б не рабіла зігзагі, усё роўна толькі набывае, усё роўна адродзіцца на новым вітку. Хрысціянства - рэлігія смерці, якая тут жа змяняецца жыццём. Кожны раз сярод беларусаў нараджаліся свае прарокі, якія ратавалі свой народ. Так будзе і далей.

Хрысціянства дзеля ўдасканалення і ўсталявання Дабра патрабуе значных высілкаў. У нашым кантэксце гэта можа выглядаць наступным чынам.

Пасіянарна апантаныя беларускай ідэяй людзі – нацыяналісты (гэтае слова я ўжываю калі не станоўча афарбаваным, дык нейтральным, якім і павінен быць навуковы тэрмін) – мусяць зразумець і прыняць светабачанне сваіх апанентаў. Трэба сцвярджаць беларускую ідэю, нічога не адмаўляючы, бо сэнс жа маральнай культуры выяўляецца ў адносінах да непадобнага да сябе. Як у І. Абдзіраловіча: "Творачы, Зруйнуем!" Не дай Божа зрабіць са сваіх суайчыннікаў, якім не пашчасціла знайсці і рэалізаваць сябе ў беларушчыне, ворагаў. У нас не павінна быць баявой псіхалогіі яшчэ таму, што зноў цытую І. Абдзіраловіча: "Не толькі дзеля карысці і з прычыны нізкіх пабуджэнняў нельга назваць сваіх ворагаў – ворагамі, а з прычыны грунтоўнай невыразнасці жыцця, калі часта самыя простыя рэчы цяжка назваць іх уласнымі імёнамі... Вялікі абшар жыцця застаецца невыразным цёмным і толькі з вялікай тугой гэтае шэрае можна назваць белым, або чорным...". Палюбіць сваіх ворагаў раіць і хрысціянства, бо любоў адна будуе, стварае, нараджае, удасканальвае.

З пункту гледжання сацыяльна-гістарычнага беларуская нацыянальная ідэя і хрысціянства суадносяцца як сістэма лакальная, прыватная і сістэма ўніверсальная, усеагульная, якія, аднак, маюць шмат тыпалагічных агульных рысаў. Але з гледзішча значнасці для духоўнага жыцця асобы, якая, напрыклад, жыве ва ўлонні беларускай культуры, гэтыя катэгорыі і адпаведныя каштоўнасці раўназначныя, а перад вечнасцю – выратавальныя.

(Другая частка артыкула Л. М. Уладыкоўскай - Канаплянік будзе надрукована ў адным з бліжэйшых нумароў.)

Уладзімір Арлоў

Ідкуль наш род

(Працяг)

Пётр Першы і Беларусь

Кожны з вас, вядома, чуў пра расейскага цара Пятра І. Ён шмат зрабіў, каб умацаваць сваю дзяржаву. Клапаціўся пра войска, пабудаваў флот. Далучыў да сваёй краіны новыя землі. Пятроўская дзяржава пачала называцца Расейскай імперыяй, а сам ён – імператарам.

У Расеі заслужана шануюць гэтага цара і лічаць яго выдатным дзяржаўным дзеячам.

Але ці варта захапляцца Пятром І нам, беларусам? Што зрабіў ён для нашай зямлі?

Паўночная вайна

Сеўшы на расейскі трон, цар Пётр вырашыў, як ён сам казаў, прасекчы акно ў Еўропу. Гэта значыць, ён хацеў адваяваць сабе бераг Балтыйскага мора і пабудаваць там свае крэпасці-фартэцы і порты для ваенных і гандлёвых караблёў. Дзеля гэтага ён пачаў вайну са Швецыяй, якой тады належалі прыбалтыйскія землі. Вайна атрымала назву Паўночная.

Вялікі князь Літоўскі і кароль Польскі Аўгуст II быў саюзнікам Пятра. Але частка беларускіх магнатаў начале з Сапегамі падтрымала шведскага караля Карла і дапамагла яму войскам. Пётр I паслаў на Беларусь 70-тысячную армію.

Так на пачатку XVIII стагоддзя нашу Бацькаўшчыну зноў напаткала вайна.

Тут адбылося некалькі жорсткіх бітваў паміж расейцамі і шведамі. Самая вялікая з іх была бітва каля вёскі Лясная на Магілёўшчыне, дзе войскам Пятра ўдалося здабыць важную перамогу.

Цар у Полацку

Калі вы прыедзеце ў Полацк, вам абавязкова пакажуць старадаўні мураваны дом, дзе ў гады Паўночнай вайны спыняўся расейскі цар. Ён пражыў у горадзе ўсяго месяц, але назаўсёды пакінуў па сабе страшную памяць, бо ўчыніў там крывавае злачынства. Прычым зрабіў гэта не дзе-небудзь, а ў святым для кожнага беларуса месцы – Сафійскім саборы.

Пётр ніколі не быў набожным. Заходзячы ў храм, ён, праўда, заўсёды здымаў з галавы парык, але нават са сваімі расейскімі папамі ніколі не цырымоніўся. Уніятаў жа ён проста ненавідзеў, бо яны не падпарадкоўваліся маскоўскім царкоўным уладам. У Віцебску цар загадаў, напрыклад, секчы і паліць уніяцкія абразы.

Аднойчы Пётр з некалькімі прыдворнымі, перад гэтым добра выпіўшы, зайшлі ва ўніяцкі Сафійскі сабор. Простых вернікаў такой парою не было, маліліся толькі шэсць святароў і манахаў. Цар гучна запатрабаваў зрабіць яму па храме экскурсію. Немалады святар айцец Канстанцін мусіў падпарадкавацца і пачаў апавядаць няпрошаным гасцям пра галоўны сабор беларускіх уніятаў.

Адзін з абразоў не спадабаўся цару, і ён ударыў святара сваім пудовым кулаком. Айцец Канстанцін упаў, і Пётр цяжка параніў яго шабляй. Беручы прыклад з раз'юшанага гаспадара, прыдворныя таксама выхапілі шаблі і распраўляліся з бяззбройнымі людзьмі. Па храме паплылі крывавыя ручаі. Уратавацца ад п'яных катаў удалося толькі аднаму святару, якога палічылі забітым. Старэнькага айца Якуба царовы служакі забралі з сабой і ўсю ноч катавалі, патрабуючы выдаць, дзе схаванае саборнае золата. Уранні айца Якуба і айца Канстанціна павесілі. Целы пяці забітых беларускіх святароў Пётр загадаў спаліць, а попел развеяць над Дзвіной, каб на іхняй магіле не маглі збірацца людзі.

Пра гэтае злачынства даведаліся ў іншых краінах. Каб спыніць непажаданыя размовы, цар выдаў адмысловы загад. Там гаварылася, што гэта самі полацкія святары напалі ў Сафійскім саборы на гасцей і тыя, каб абараніцца, мусілі іх забіць. У Расейскай дзяржаве заўсёды ўмелі з чорнага рабіць белае.

Царская помста

За вольналюбнасць і незалежнасць Пётр I жорстка пакараў не толькі полацкіх уніятаў, але і іхні сабор. Спачатку храм святой Сафіі аддалі салдатам на рабаванне, а потым зрабілі па загадзе цара вайсковым складам. Там трымалі розныя прыпасы, а часам і коней.

У саборных сутарэннях расейцы захоўвалі порах. Досыць было іскрынкі, каб беларуская святыня ўзляцела ў паветра.

І такая іскра ўспыхнула якраз напярэдадні адыходу з Полацка царскіх войскаў.

Вядома, здарылася гэта невыпадкова.

Сафійскі сабор ператварыўся ў куродымныя руіны. Трыццаць гадоў яны стаялі на высокім полацкім замчышчы, выклікаючы ў сэрцах палачанаў і тых, хто плыў па Дзвіне, глыбокі смутак, нагадваючы пра цяжкія страты роднай зямлі.

У сярэдзіне XVIII стагоддзя уніяты адбудавалі сабор. Тады ён і набыў знаёмае нам сучаснае аблічча.

Саюзнікі ці захопнікі?

Расейскі імператар і ягоныя людзі трымаліся ў Беларусі не як саюзнікі, а як захопнікі.

Так было не толькі ў Полацку.

Гістарычныя дакументы апавядаюць, як паводзіў сябе ў Магілёве сябра і паплечнік цара Аляксандр Меншыкаў. Заняўшы горад, ён запатрабаваў ад жыхароў карміць і паіць сваё вялікае войска. Кожны дзень магілёўцы былі абавязаны дастаўляць "саюзнікам" некалькі бочак віна, мёду і піва, жывога вала, некалькі дзесяткаў бараноў, некалькі асятроў і самоў, цэлыя чароды гусей і курэй, сто булак і дзвесце калачоў, а таксама разынкі, міндаль і іншыя прысмакі. Горад выконваў усе загады, але, замест удзячнасці, быў спалены.

Ад расейцаў Беларусь зазнала гора не менеш, чым ад шведаў.

Царскія казакі з чатырох бакоў падпалілі Віцебск. Горкія ўспаміны засталіся ад "саюзнікаў" і ў Менску.

Там расейская кавалерыя абчысціла жаночы манастыр святой Тройцы, ад якога пайшла назва сённяшняга Траецкага прадмесця. Шукаючы золата, зладзеі паламалі ў манастырскім саборы алтар і ўзадралі падлогу. Потым надышла чарга Святадухаўскай царквы на Высокім рынку (там, дзе цяпер плошча Свабоды) ды іншых манастыроў і храмаў.

Менчукі ўзяліся за зброю, і на Нямізе адбылася яшчэ адна бітва.

За гады Паўночнай вайны беларускі народ страціў 800 тысяч чалавек. Загінуў амаль кожны трэці. Гэтая вайна і жорсткі расейскі цар Пётр не прынеслі Беларусі нічога, апрача крыві, пажараў і разбурэнняў.

Пытанні і заданні:

1. *Чаму Пётр I паслаў на Беларусь сваё войска?*
2. *Якое злачынства ўчыніў цар у Полацку?*
3. *Як цар адпомсціў Сафійскаму сабору?*
4. *Раскажы, як Пётр і ягоныя людзі паводзілі сябе на нашай беларускай зямлі.*
5. *Ці ёсць у беларусаў якія-небудзь падставы шанаваць памяць Пятра I ?*



Пётр I ў Полацкім Сафійскім саборы

Крычаўскае паўстанне

Жыццё пад прыгнётам

Гэта было 250 гадоў назад.

Вакол старажытнага беларускага горада Крычава раскінуліся на берагах Сожа землі Крычаўскага староства. Тут жылі працавітыя і таленавітыя людзі – хлебаробы і ганчары, цесляры і муляры. У майстэрнях-гутах зараблялі сабе хлеб шкларобы-гутнікі. Умелі крычаўцы рабіць добрую зброю. Асабліва славіліся крычаўскія гарматнікі, якіх запрашалі вучыць свайму майстэрству ў суседнюю Маскоўскую дзяржаву.



Крычаў у XVIII ст. *Паводле карціны М. Іванова*

Прыгожая і багатая была тут зямля, але бедна жылі на ёй людзі. З году ў год іх усё больш прыгняталі жорсткія ды сквапныя арандатары – тыя, каму на некалькі гадоў аддаваў староства за грошы ягоныя гаспадар. Арандатары імкнуліся паспець выбіць за адведзены ім час, як мага больш прыбытку. Паны Валкавіцкія толькі за два гады сабралі з крычаўцаў і паклалі сабе ў кішэню 100 тысяч злотых звыш законных падаткаў.

Вялікім няшчасцем былі для Крычаўскай зямлі таксама пастоі каралеўскага войска. Жаўнеры прымушалі сялянаў і гараджанаў за свой кошт карміць і паіць цэлыя палкі. Крычаўцы скардзіліся на крыўдзіцеляў свайму гаспадару, але той адмахваўся ад іх, як ад надакучлівых мух.

Князь Геранім Радзівіл

Крычаўскае староства належала князю Гераніму Радзівілу.

Род Радзівілаў, пра які мы ўжо казалі і раней, быў у Беларусі самы багаты і магутны. Ён мог паспрачацца з самім каралём і вялікім князем. Сталіцаю Радзівілаў лічыўся горад Нясвіж, але ім належала безліч земляў і прыгонных сялянаў і ў Беларусі, і ў Жамойці, і на Украіне. Гэты род меў сваё войска, трымаў на азёрах і рэках свой флот і нікога не баяўся. Нездарма тады казалі: "Кароль у Варшаве, а Радзівіл у Нясвіжы".

Сярод Радзівілаў трапляліся розныя. Былі добрыя ваяводы, як, напрыклад, князь Юры, які перамог у пяцідзесяці бітвах і атрымаў за гэта мянушку Геркулес. Былі людзі вельмі адукаваныя, якія збіралі рэдкія кнігі, дапамагалі мастакам і пісьменнікам, адчынялі школы. У мястэчку Смаргонь Радзівілы трымалі "мядзведжую акадэмію". Так называлася школа, дзе мядзведзяў навучалі розным смешным і вясёлым штукам.

Трапляліся сярод Радзівілаў і самадуры. Адзін, напрыклад, загадаў навазіць у Нясвіж солі, пасыпаць ёю заместа снегу дарогу і ўлетку катаўся на санях, запрэжаных мядзведзямі.

Князь Геранім быў чалавек разумны, але страшна прагны і бязлітасны. Ён кінуў у турму роднага брата і здзекаваўся са сваіх жонак. Мог ні за што павесіць пад вокнамі спачывальні слугу. Мог загадаць зашыць у мядзведжыя шкуры і кінуць на разарванне сабакам непакорлівых сялянаў.

Вось да якога чалавека траплялі скаргі крычаўскіх людзей.

(Працяг у наступным нумары.)

Жывая кніга прыроды

Для педагогаў дашкольных установ
Укладальнік Ірына Марачкіна

МАРОЗ

На дварэ – мароз.
Снег да стрэх прырос.
Змерзлі рукі,
Змерзлі ногі,
Стаў чырвоны нос.

Ой, мароз, мароз!
Шчыпле твар да слёз,
Цёпла толькі снежнай бабе,
Ды не ляскае зубамі
Белы Дзед Мароз.

Ларыса Геніюш.

ЛЁГКІЯ СНЯЖЫНКІ Ў ЦІШЫ...

Легкія сняжынкі ў цішы
Долу апускаюцца нясмела...
Светла ў полі, светла на душы...
Лёгкія сняжынкі ў цішы...

Спіць сасна ў бахматым шалашы,
А навокал так бялютка-бела...
Легкія сняжынкі ў цішы
Долу апускаюцца нясмела.

Данута Бічэль-Загнетава.

Не сядзіцца ўхаце хлопчыку малому...

Не сядзіцца ў хаце
Хлопчыку малому:
Кліча яго рэчка,
Цягнуць санкі з дому...
- Мамачка-галубка! –
Просіць ён так міла, -
Можа б ты на рэчку
Пагуляць пусціла?
Я не буду доўга,
Зараз жа вярнуся,
Трошачкі на рэчцы
У санках паважуся.
- Ну ідзі пабегай,
Толькі апраніся
Ды глядзі, у палонку,
Сынку, не ўваліся,
Радасць і раздолле
Хлопчыку малому,
І не пазайздросціць
Ён цяпер нікому!

Якуб Колас.



Жыццё раслін зімой замірае... Журботна стаіць голы лес. Толькі дуб не скідае свайго мядзянага ўбранства аж да самай вясны. Застаюцца зялёнымі сосны, елкі і ядлавец. Цікава, што і пад снегам шмат якія расліны зімуюць у сваім летнім адзенні. Гэта журавіны, буякі, бруснічнік і іншыя. Чым таўсцейшая снегавая коўдра іх пакрывае, тым цяплей, лепш пачуваюць яны сябе.

ЗІМОВЫ ДУБ

Ідзе лесам Лістапад, лісце сыплецца, як град, сякуць дажджы касыя, шумяць вятрыскі злыя... Дрэвы нізка кланяюцца Лістападу, сцелюць пад яго пажоўклае лісце. Адляцелі ў вырай птушкі, звяры пахаваліся ў зацішак, апусцелі палі.

Задаволены Лістапад: усё скарылася яму. Усміхнуўся, паслаў на зямлю бледны сонечны прамень, глянуў з-за шэрых хмар лапінкай блакіту. Але што гэта? Вунь на ўзлессі раскінуў вецце магутны дуб, увесь у мядзянай лістоце.

- Чаму ты не скарыўся мне? – грозна спытаў Лістапад.

- Я зімовы. Таму да вясны буду ў мядзяным убранні. Угневаўся Лістапад.

- Гэй, вятры буйныя! – паклікаў ён сваіх памочнікаў. – Сарвіце з дуба яго мядзяны ўбор!

Завылі вятры, зашумелі галіны Дуба.

- Гэй, дажджы халодныя! – гукнуў Лістапад. – Пазбівайце з Дуба лісце.

Секанулі дажджы, забарабанілі па буйным лісці, але Дуб не зварухнуўся.

- Гэй, браце Снежань, - загукаў Лістапад. – Прышлі мне марозу пякучага, завеяў сыпучых, няхай замарозяць снегам непакорнага!

Прымчалі маразы, прыляцелі завеі, марозілі, снегам секлі, але не скарыўся Дуб.

Спахмурнеў Лістапад і адступіўся ад цара лесу... Усю зіму стаіць Дуб у сваім мядзяным адзенні. Толькі вясною ненадоўга скідае яго, каб пераапрануцца ў новае, зялёнае. За гэта называюць яго Зімовым Дубам.

Клаўдзія Каліна.



З НОВЫМ ГОДАМ

Год за годам - карагодам,
І ўжо сёння з Новым годам
Я сардэчна, ад душы
Вас віншую, малышы!
А чаго ж я вам жадаю?
Зараз, зараз прыгадаю...
Каб бадзёрымі былі вы,
Каб разумнымі раслі вы,
Каб прынёс вам Новы год
Многа радасных прыгод.
І здароўя ў вашы хаты, -
Каб былі здаровы самі,
Каб былі здаровы мамы,
Каб былі здаровы таты,
Каб не ведалі напасці,
Каб і я за вас быў рад.
З Новым годам!
З новым шчасцем!
Вас віншуе дзед Кандрат.

Кандрат Крапіва.

ЁЛАЧКА

Узышла ў лесе ёлачка,
У лесе і расла,
Узімку, улетку стройная,
Зялёная была.
Мяцеліца ёй песеньку
Пяяла: баю-бай.
Мароз сняжком атуліваў:
Глядзі, не замерзай!
Пужлівы зайчык шэранькі
Пад ёлачкай скакаў,
Падчас і воўк, сярдзіты воўк,
Ускоч перабягаў.
Цяпер яна, прыбраная,
на свята к нам прыйшла
І шмат пацехі, радасці
Для дзетак прынясла.

Пераклад з рускай мовы Янкі Купалы.

ДЗЕД – ГОСЦЬ

Ходзіць дзед белабароды
Полем, лесам, пералескам,
Засцілае рэчкі лёдам,
Брыльяністым снежным блескам.
Сыпле іней на бярозы,
Туліць дрэвы лёгкім пухам,
Крые рэкі, травы, лозы
Белай воўнаю - кажухам...
Дзеда ўсюды носяць ногі,
І к нам прыйдзе на хвілінку
Адпачыць крыху з дарогі,
Важна сеўшы на ялінку,
А ялінка!... Чаго толькі
На яе няма галінках!
Свецяць зоркі і вясёлкі
У бліскучых павуцінках.
Тут лісічка, зайчык, мышкі
Рыбкі, буслік даўгавязы.
А як ззяюць на ёй шышкі,
Нібы ў іх гараць алмазы!
Каля ёлкі карагоды,
Песні, гутарка жывая,
А той дзед белабароды
Толькі ў вусы смех пускае.
Дык рассунем кола шырай.
Патанцуем на памосце,
Песняй звонкай, песняй шчырай
Прывітаем дзеда-госця.

Якуб Колас.

Давайце спяваць па-беларуску

УЛІС

Калі Імпэрыя зьнікне

С.Краўчанка – Ф.Аксёнцаў

G C G
Дзе знайсці цябе,
C C G CGC
У горадзе змрок,
G C G
Я не пайду туды,
C G CG
Ратуй мяне Бог.

G C
У зруйнаванай хаце
D G CG
Я чытаю ад цябе ліст,
G C
На паперы словы,
D G CG
Тваіх куль на двары візг.

G C G C G C GC
Кажаш ты-ы, прыйдзе ча-ас,
G C G C G C G
Адпачне-е кожны з на-ас.
G C
Бойкі ды пагромы,
D G CG
Не чакай замежных гасьцей,
G C
Голад і хваробы
D G CG
Забіваюць нашых дзяцей.

C Am Em
Калі Імпэрыя зьнікне, як дым,
C Am Em
Дзе будзеш ты й з кім?
C Am Em
Чыю трымаеш ты зброю мой брат,
C Am D G CG
Які натоўп твой урад?

Што будзе потым тут карчма ці гурма?
За падарунак твой падзякі няма,
Заліты крывёю барыкады ў маіх снах,
Скрыжаваньні вуліц,
Вайны грамадзянскай жах.

Кажаш ты, прыйдзе час,
Адпачне кожны з нас.
Цягнікі на поўнач?
Побач зь цягнікамі на ўсход,
Рэйсы да курортаў
Дзе агароджвае дрот.

Калі Імпэрыя зьнікне, як дым...

Імперыя знікае цяжка

5 снежня адбылося шэсце і ўскладанне вянкоў да помніка на плошчы Перамогі і на выспе "Жалю і слёз", прысвечанае памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, загінуўшых у Афганістане. Акцыю правяла Менская гарадская арганізацыя ветэранаў вайны ў Афганістане. Ці не з'явіцца ў выніку саюза з Расеяй выспа для ветэранаў Чачні?

На здымку: у час шэсця.
Фота Віктара Талочкі,БелТА.



Рэдактар Станіслаў Суднік

Заснавальнік:
ТБМ імя Францішка Скарыны.
Пасведчанне аб рэгістрацыі:
№ 83 ад 28 чэрвеня 1996 г.
Адрас рэдакцыі:
220005, г. Менск, вул. Румянцава, 13.
Адрас для паштовых адпраўленняў:
231300, г. Ліда-2, п/с 7.
E-mail: ns@lida1.lingvo.grodno.by

Рэдакцыйная калегія:
Людміла Дзіцэвіч, Алесь Гурыновіч, Леакадзія Мілаш, Язэп Палубятка, Алесь Петрашкевіч, Уладзімір Содаль, Станіслаў Суднік, Павел Сцяцко. Алег Трусаў.

Аўтары цалкам адказныя за падбор і дакладнасць прыведзенай інфармацыі

Газета надрукавана ў Лідскай друкарні.
231300, г.Ліда, вул. Ленінская, 23.
Газета падпісана да друку 20. 12. 99 г.
Наклад 3400 асобнікаў. Замова № 3487
Падпісны індэкс: 63865.
Кошт падпіскі: 1 мес.- 100 000 руб., 3 мес.- 300 000 руб.
Кошт у розніцу: 25 000 руб.